*За беларускую мову...* ☞ 3


# Ніва

**ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ**

*PL ISSN 0546-1960* *NR INDEKSU 366714*

*Выбарчая кветка...* ☞ 8


**http://niva.iig.pl**
**redakcja@niva.iig.pl**

**№ 26 (2824) Год LV** | **Беласток, 26 чэрвеня 2010 г.** | **Цана 2,50 зл. (VAT 0%)**


Тэкст і фота Ганны КАНДРАЦЮК

# Беларускі садок — неабходная ўстанова!

*Дзеці, бацькі і настаўніцы ў супольнай пастаноўцы „Як ехаў Ясь у сваты”*

Пра славу беларускага садка ў Беластоку нашая грамадскасць гаворыць з пазітыўным недаверам:

— А ці гэта праўда, што там не ўсе могуць дастацца? — спытае нас некалькі гадзін да юбілею настаўніца беларускай мовы з Дубін. Калі пачуе нашае „так”, спачатку не можа паверыць. Гэты момант усведамляе нам прэстыж, якога дабілася беларуская адукацыйная ўстанова. Наша настаўніца са звышдваццацігадовай практыкай найлепш ведае колькі сілы і сэрца патрабуе такі вынік. Каб заахвоціць сваіх вучняў хадзіць на беларускую мову, яна робіць магчымае і немагчымае, звычайна сама адна, без падтрымкі бацькоў і калектыву. І нават калі ў іх свае поспехі, няма як імі цешыцца, бо пры мізэрнай ангажаванасці асяроддзя яны проста не цікавяць!

* * *

Калі пятнаццаць гадоў таму ў Беластоку адкрываліся беларускія групы ў Прадшколлі № 14, жменька бацькоў магла разлічваць адно на сябе. На нашым баку былі юрыдычныя законы, якія спрыяюць нацыянальным меншасцям у адукацыі на роднай мове. І гэта была аснова, на якую абапіраліся старанні, часта марудныя і не надта прыемныя. Хоць больш за фармальнасці хвалявала абыякавасць з боку грамадскасці і беларускіх асветных улад адказных за навучанне мовы (канкрэтна: БГКТ). Каб назбіраць сорак дзетак, бо такое патрабаванне паставілі ўлады горада, Барбара Пякарская спачатку званіла да сваіх знаёмых, а пасля да незнаёмых людзей, знойдзеных у тэлефоннай кніжцы. Праблемы з наборам адпаведнай колькасці дзяцей доўжыліся праз тры першыя гады. За гэты час супольнымі сіламі нам удалося разгарнуць добрую славу вакол садка. Вялікую ролю ў інтэграцыі асяроддзя бацькоў адыгралі беларускія этнічныя пастаноўкі, які ставілі мы разам з дзяцьмі і настаўніцамі. Іх паказвалі не толькі ў прадшколлі, але і пры беластоцкіх цэрквах, дамах культуры, часам выязджалі ў глыбінку, каб там заражаць энтузіязмам. У выніку атрымаўся цыкл пастановак на арыгінальныя сцэнарыі, напісаныя бацькамі дзетак, а пасля выдадзеныя імі друкам пад загалоўкам „Ад абраднасці да тоеснасці”. Вядома, гэта быў прыгожы дадатак да штодзённай і грунтоўнай працы настаўніц. Выпускнікі беларускага прадшколля ад пачатку свайго існавання ішлі ў школу з найлепшай падрыхтоўкай. Развіццё ўстановы выпадае разам з прыходам на пасаду дырэктара Луцыі Неміровіч. Удвая расце колькасць навучэнцаў, грунтуецца настаўніцкі калектыў (сёння ў прадшколлі працуе аж сем настаўніц), дзейнічае вакальна-танцавальны калектыў „Вясёлка”, які ў апошнія гады перамагае на цэнтральных беларускіх мастацкіх конкурсах.

Бацькі таксама выступаюць на сцэне разам з дзяцьмі і настаўніцамі, а іх спектакль „Як ехаў Ясь у сваты”, які яны самі напісалі і паставілі, выклікаў проста фурор!

* * *

Выпускнікі, сучасныя навучэнцы (іх 85 асоб), бацькі, запрошаныя госці, якія 17 чэрвеня г.г. з’явіліся на юбілей наладжаны ў Ваяводскім асяродку культры (у г.зв. Сподках), ледзь памесціліся ў зале. Пасля віншаванняў і падарункаў (наша рэдакцыя, супольна з радыё „Рацыя”, падарыла мастацкі банэр аўтарства Міраслава Здрайкоўскага, у прыватнасці бацькі дашкольшіка беларускіх груп). Гаспадары ў сваю чаргу падрыхтавалі цудоўную мастацкую праграму: спектакль „Дзівосны гадзінік”, мультымедыйную прэзентацыю „Выпускнікі садка” (іх 145, а былыя дашкольнікі першых двух гадоў ужо студэнты), прэзентацыю кампакт-дыска вакальна-танцавальнага калектыву „Вясёлка”, пастаноўку „Як ехаў Ясь у сваты” ды выступленне музычнага гурту „Світанак”, у якім спяваюць усе настаўніцы. Падобная мастацкая з’ява не выступае ні ў адной нашай адукацыйнай установе, і гэта таксама дадатковы козыр у бок беларускага садка.

Барбара Пякарская, якая на роўні з дырэктар Луцыяй Неміровіч і яе таленавітымі кадрамі атрымала шмат віншаванняў і слоў падзякі, не скрывала слоў прызнання:

— Гэта вялікі поспех настаўніц, але таксама і нас усіх бацькоў і людзей, якія аказвалі падтрымку. Тое, што бачым і адчуваем сёння, пасля пятнаццаці гадоў, сведчыць пра нас як беларусаў. Тут відавочная вялікая ангажаванасць і сэрца людзей. Гэта такая праўда пра нас, пра тое, што родная мова мае для нас вартасць.

Усе прысутныя выпускнікі былі абдараваныя кампакт-дыскам „Вясёлкі” і добрымі словамі ад сваіх былых настаўніц. І калі найстарэйшыя з іх, ужо на вясёлай ноце, праспявалі песню з дзіцячага садка, мне падумалася, што праз пяць-дзесяць гадоў яны самі ўжо будуць пасылаць дзетак у беларускі садок. За пятнаццаць гадоў існавання беларускі садок стаў успрымацца як патрэбная, а нават неабходная, адукацыйная ўстанова ў Беластоку. Гэта заўважыў нават Ян Сычэўскі, ганаровы госць юбілею, які сказаў, што не ўяўляе сабе мерапрыемстваў БГКТ без удзелу нашых малых і прыгожых спевакоў і акцёраў.


Свіслач • Гародня • Ваўкавыск • Шчучын • Гайнаўка • Высокае • Масты • Беласток • Бельск-Падляшскі • Сямятычы

98,1 FM

БЕЛАРУСКАЕ РАДЫЁ РАЦЫЯ

www.racyja.com



## *У дарозе за Янам Тарасевічам* ☞ 4

*Ганна КАНДРАЦЮК*

## *Сустрэча з Юры Туронкам* ☞ 5

*Аляксандр ВЯРБІЦКІ*

## *Самаўрады і беларуская культура* ☞ 9

*Аляксей МАРОЗ*

9 770546 196000

# Выбар Польшчы

*Гэтыя радкі пішуцца ў дзень прэзідэнцкіх выбараў у Польшчы. Выбараў датэрміновых і надзвычайных, якія прыйшлі ў выніку вялікай трагедыі пад Смаленскам і гібелі апошняга прэзідэнта. Выбараў, якія праходзяць на фоне прыродных катаклізмаў і мноства праблем. Выбараў, ад якіх будуць залежаць лёсы не толькі палякаў і беларусаў Польшчы, але ў пэўнай ступені і нас, грамадзян Рэспублікі Беларусь. З усіх нашых пяці суседзяў найбольшы ўплыў на Беларусь робяць, канешне, найперш палітычныя падзеі ў Расіі. Але палітычны расклад у Польшчы і Украіне таксама для нас вельмі важны.*

*Светлай памяці Лех Качыньскі разам са сваімі паплечнікамі, як мне здаецца, мелі сваю знешнепалітычную канцэпцыю. Нібыта, паводле правілаў існавання дзяржавы, такую дактрыну павінна мець кожная самастойная краіна. Ды толькі ў сённяшняй палітыцы гэта ўжо рэдкасць. Ізноў жа выкажу асабістую думку — Польшча пры Качыньскім мела свой цвёрды голас у Еўрасаюзе — геапалітычным утварэнні, дзе ўмовы пераважна дыктуюць ініцыятары гэтага стварэння, моцныя кантынентальныя дзяржавы, а бальшыня краін выконвае ролю статыстаў. Лех Качыньскі меў сваю, часам адрозную ад іншых, пазіцыю і меў смеласць яе выказваць — якасць, якую нячаста сёння сустрэнеш у еўрапейскай палітыцы.*

*Лех Качыньскі і яго каманда ўганаравалі прадстаўнікоў беларускай супольнасці ў Рэчы Паспалітай Алега Латышонка і Яўгена Вапу высокімі дзяржаўнымі ўзнагародамі — Кавалерскімі крыжамі Ордэна Адраджэння Польшчы. Гэта было справядлівае і заслужанае прызнанне ўкладу беларусаў Беласточчыны ў справу здабывання вольнасці і развіццё дэмакратыі. Адначасна гэта было і пасланне грамадзянскай дэмакратычнай супольнасці ў Беларусі, якое было ўспрынята з вялікім энтузіязмам. Разам з тым, палітыка польскіх элітаў, пасвараных і падзеленых паводле многіх разыходжанняў, у дачыненні да Беларусі была апошнія гады досыць непаслядоўнай, а часам і супярэчлівай. Стаўленне да ўрада Рэспублікі Беларусь, да дэмакратычнай апазіцыі, да сітуацыі з Саюзам палякаў у Беларусі не вылучалася цвёрдасцю і лагічнасцю пазіцый.*

*У гэтым сэнсе цікава ці здолее новаабраны прэзідэнт, хто б ім не стаў, у цяжкіх варунках крызісу выпрацаваць трывалую лінію дачыненняў з суседзямі. І тут хвалюе адна трывожная тэндэнцыя — а менавіта збліжэнне Польшчы з сённяшняй Расіяй. Падкрэслю, менавіта з цяперашняй Расіяй, з пуцінскай Расіяй. З такой Расіяй, у якой няма месца ні правам чалавека, ні вольнасці людзей, ні нармальнаму эканамічнаму развіццю. З такой Расіяй, дзе жыццё чалавека не каштуе і граша, дзе галоўнай ідэалогіяй з'яўляецца сляпы імперскі шавінізм, дзе пануе ксенафобія, дзе рэгулярна забіваюць журналістаў і незалежных палітыкаў. Няўжо некаторыя польскія палітыкі пасля катастрофы самалёта сапраўды паверылі ў „кракадзілавы слёзы" пуцінскай хунты, якая сядзіць у Крамлі!? Няўжо яны такія наіўныя? Альбо ўсё засланяе меркантыльны інтарэс сённяшняга дня, а што будзе заўтра, ужо не цікавіць. Нібыта расійскае кіраўніцтва пагадзілася прызнаць праўду Катыні. Асуджэнне злачынства 1940 года сённяшняй Масквой, прызнанне, што яго здзейсніла тагачасная сталінская дзяржава, было б прызнаннем гістарычнай праўды. А таксама ўскосным, але досыць яскравым доказам непрыналежнасці сённяшняй расійскай улады да „Катыні-2". І вось што мы чуем акурат перад выбарамі новага прэзідэнта Польшчы, пасля нібыта пацяплення дачыненняў паміж дзяржавамі і сяброўскіх абдымкаў. Галоўны ваенны пракурор Расіі Сяргей Фрыдзінскі заяўляе (цытую ў арыгінале): „Главная военная прокуратура России не видит оснований для возобновления расследования Катынского дела. Виновные установлены и объявлены и новое расследование не нужно... Закон не позволяет вести дальнейшее расследование, так как истекли сроки давности... это не было преступление, совершенное от имени государства и расстрелянные польские военнопленные не могут быть жертвами политических репрессий. Они были убиты конкретными личностями, в деле называются те, кто принимал решение". На гэтым, маўляў, кропка. Як вам такая цынічная трактоўка? На іншае пуцінскі рэжым папросту няздольны паводле сваёй прыроды.*

*У нас, беларусаў, ужо сфармавалася за апошняе дзесяцігоддзе пэўная пазіцыя датычна палітычных падзей і працэсаў, што адбываюцца наўкола — не чакаць ад іх нічога добрага. Каб потым расчараванне было не такім моцным...*

**Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ**

# Мы „Тут былі і будзям" дзядзькі Анатоля

*Анатоль Парэмбскі нарадзіўся ў 1927 годзе ў Страшаве. Усё жыццё пражыў на Гарадоцкай зямлі — у Страшаве, Мастаўлянах, на Станцыі Валілы. Далей апрацоўвае родную зямельку, гаспадарыць, хоць яму ўжо за восемдзесят.*

*Дэбютаваў 21 чэрвеня 1941 года. Ад часу, калі ўзнік тыднёвік беларусаў у Польшчы „Ніва" — ад 1956 года — быў ён яго карэспандэнтам і хранікёрам тутэйшага быцця. Усё жыццё расказвае ў вершах пра тутэйшасць — былое-гістарычнае ды цяперашняе, каменціруе яго лірычна, публіцыстычна і жартам. З'яўляецца актыўным членам Літаратурнага згуртавання „Каласы" ў Гарадку, якое свае творы прадстаўляе друкам (у прэсе і альманахах) ды на сцэне. Выдаў зборнік вершаў „Хвалі лёсу", з якога творы ахвотна выбірае моладзь гарадоцкіх школ для дэкламацыі. Таксама творы з навейшага тома выклікалі зацікаўленне маладых дэкламатараў, якія іх ужо з рукапісаў, атрыманых ад аўтара, агучылі на конкурсах „Роднага слова".*

*У зборнік уключаны творы краязнаўчага, гістарычнага, сатырычнага і лірычнага характару, якія каменціруюць падзеі актуальныя не толькі на тэрыторыі найбліжэйшай пажылому паэту-селяніну. Прыгожа апісвае ён родныя краявіды, чалавечы лёс у гісторыі, даўнейшую і сучасную гісторыю старажытнага горада Хадкевічаў і прападаючых забытых вёсак, якія засталіся ў яго памяці як бурліўшыя жыццём. Не толькі настальгія прамаўляе з твораў Анатоля Парэмбскага. Ён — выдатны сатырык! Вось верш „Выкідайце тэлевізар" стаў вельмі папулярным не толькі сярод моладзі. Класічная форма вершаў, якая даспадобы ўмеламу аўтару, спрычыняецца да таго, што ахвотна выкарыстоўваюць іх тутэйшыя музыкі як словы песень („Кацярынка"). Думаю, што новы зборнік будзе таксама знакамітым дапаможнікам для настаўнікаў беларускай мовы не толькі ў школах на Гарадоччыне — як прыклад жывой мовы і збор актуальных тэкстаў для дэкламацыі і аналізу.*

*Кніжачка выйшла як першае выданне Гміннага цэнтра культуры ў Гарадку — у Gródeckiej Oficynie Wydawniczej, у графічнай апрацоўцы Паўла Грэся. Падтрымала ініцыятыву Маршалкоўская ўправа Падляшскага ваяводства ў Беластоку.*

**Міра ЛУКША**

*Анатоль ПАРЭМБСКІ*

# Захаваць свае прыметы

*Зіма пройдзе, прыйдзе лета...*
*Дзеецца ад векаў гэтак.*
*Дарастаем і старэем.*
*Вецер нас кругом абвее,*
*Болей у вочы, менш да згоды...*
*Усякія ў нас прыгоды.*
*Каб сабраць іх — будзе кніжка!*
*Успомніцца Дзям'ян і Мішка,*
*І Надзейка Сінявока...*
*Колькі ран у душы глыбокіх*
*І ад ворагаў, і блізкіх...*
*І да сёння ў сэрцы блізны.*
*Ад маленства аж па старасць,*
*Не зачаста была радасць.*
*Цыганом малых страшылі,*
*У школе ў лапу вучняў білі.*
*Войны бралі татаў дзеткам.*
*Жалі на чужых палетках.*
*Дараслі, было нялёгка*
*Выбіцца ў свет шырокі.*
*Мовай і культурай можам*
*Разіць вока ў вяльможаў.*
*Колькі ж пражылі няволяў*
*І з-за волі, і з няволі.*
*Акупанты з усіх бокаў.*
*Каб датрымаць свету кроку,*
*Прабіваемся як можам.*
*З бояззю і асцярожна.*
*За акном шарэе восень*
*Вецер дзікі як заўсёды*
*І нагнаў да нас з заходу*
*Нам не знаны стыль і моду.*
*І таму, каб быць сабою,*
*Захаваць свае прыметы,*
*Цэлым родам заспяваем*
*„Люблю свой край, старонку гэту!"*

**Вачыма еўрапейца**

# Дні Беластока

*Працягваюцца пятнаццатыя Дні Беластока. Сёлета сарганізавалі іх з вялікай пампезнасцю. Мабыць, сталася гэта якраз з-за юбілею, спалучанага з нядаўнім святкаваннем дваццацігоддзя самаўрада, якое адзначалася ў Беластоку пад ратушу, а можа і ў сувязі з восеньскімі самаўрадавымі выбарамі. Выступаюць, значыцца, знакамітасці польскай эстрады такія як „T. Love", Рышард Рынкоўскі, Кая і „Zakopower", ці ўрэшце зорка са ЗША Сюзан Вега. Традыцыйна арганізатарам Дзён з'яўляецца Беластоцкі асяродак культуры, а ангажуюцца ў іх усе апошнія культурныя цэнтры падлеглыя беластоцкаму самаўраду. Сёлета імпрэза спалучаецца таксама з пятым юбілейным Фестывалем лялечных школ, міжнародным мерапрыемствам беластоцкай Тэатральнай акадэміі. Канцэртаў, выставак, сустрэч і г.д., сарганізаваных у рамках Дзён не пералічыць; іх пару дзесяткаў.*

*У праграме дзесяцідзённых святкаванняў (Дні працягнуцца да 27 чэрвеня) дашукваўся я меншасных мерапрыемстваў, а асабліва тых, якіх прыкметай з'яўляецца беларушчына і ўвогуле культура нацыянальных меншасцей пражываючых у нашым горадзе. Тым больш, што адным з вядучых лозунгаў вылучаючых „Узыходзячы Беласток" з'яўляецца — як часта адзначаюць мясцовыя ўладары — шматкультурнасць, якую скланяюць на ўсе лады. Нават апрацавалі спецыяльную маркетынгавую праграму турыстычнага прадукта звонага „Беластокам шматлікіх культур". З цікаўнасцю пайшоў я на прэс-канферэнцыю перад сёлетнімі Днямі, падрыхтаваную ў выглядзе гэтак званых чацвярговых прэсавых сняданкаў з удзелам прэзідэнта Беластока Тадэвуша Трускаляскага. Спытаўся я ў пана прэзідэнта, ці прадбачваюцца нейкія імпрэзы меншасныя ў поўным сэнсе гэтага слова. Адказаў:*

*— З бюджэту дафінансавалі мы Брацтва праваслаўнай моладзі і сарганізаваны ім канцэрт царкоўнай музыкі ў Мікалаеўскім саборы [адбыўся ён 20 чэрвеня — М. Х.]. Рыхтуючыся да гэтага мерапрыемства, не дзелім арганізацый на большасныя і меншасныя. Для нас усе жыхары Беластока роўныя. Кожны, хто заяўляе свой удзел у гарадскіх мерапрыемствах, атрымлівае дафінансаванне. Няма тут нацыянальнага ці канфесійнага ключа.*

*— Дык як вядучы гарадскі лозунг „шматкультурнасць" упісваецца ў гэтую імпрэзу? — я не адпускаў.*

*— Шматкультурнасць якраз — у роўнай даступнасці. І стараемся яе гарантаваць усім, хто ўключаецца ў грамадскае жыццё горада.*

*Не ўлічваючы ўспомненага прэзідэнтам канцэрта ў Мікалаеўскім саборы, нічога меншаснага ў юбілейных Днях няма, а ўжо зусім няма нічога спасылаючагася на жывыя яшчэ шматлікія культуры. На маю думку, якраз Дні Беластока павінны быць тым мерапрыемствам, якое „апраўдвае" гэты лозунг. Адзін з калег журналістаў, з якімі падзяліўся я сваімі думкамі ў час прэсавага сняданку, пажартаваў (здаецца):*

*— Ну як няма нічога шматкультурнага. Выступае ж В'етнамскі тэатр на вадзе з Ханоя. А яшчэ ёсць і выстаўка аб нямецкай, аўстрыйскай і швейцарскай культурах, ну і ёсць жа Фестываль яўрэйскай культуры.*

*Прытым зацікавіла мяне ў час таго сняданку загадчыца Дома культуры „Śródmieście", якая заахвочвала да ўдзелу ў канцэртах і выступленнях ансамбляў даўняй — дворскай музыкі:*

*— Выступіць Рэпрэзентацыйная гвардыя з Новай Дэмбы. Гэта будзе пятнаццаць мужыкоў, якія прыедуць і пакажуць.*

*Нам, шматкультурным беларусам, застаецца ў час працягваючыхся яшчэ Дзён захапляцца культурамі в'етнамцаў, германцаў, яўрэяў, ну і з палаючымі шчокамі глядзець, што гэта такое паказваюць мужыкі з Новай Дэмбы.*

**Мацей ХАЛАДОЎСКІ**

Тэкст і фота Ілоны КАРПЮК

# ЗА БЕЛАРУСКУЮ МОВУ Ў КРЫНКАХ

Іаанна Чабан

Аліцыя Міран

**Дырэктар Марк Францкевіч, Курыторыя асветы ў Беластоку:**

— Атрымалі мы пісьмо ад спадарыні Іаанны Чабан, накіраванае ў школу ў Крынках і да ведама бурмістру Крынак і нашай Кураторыі, з якога вынікала, што школа не цалкам спраўляецца з абавязкам арганізацыі навучання беларускай мовы, але бракавала там дэкларацыі бацькоў, якія хацелі б навучання. Патэлефанаваў я спадарыні дырэктар і папрасіў высветліць гэтую справу і сабраць дэкларацыі бацькоў.

2-е чэрвеня. Крынкі

— Я правяла анкетаванне на бацькоўскай сходцы, — гаворыць дырэктар Комплексу самаўрадавых школ у Крынках Аліцыя Міран. — Тых, якія прыйшлі, запытала: „Ці хочаце, каб вашае дзіця вучылася беларускай мове ў нашай школе?” З прысутных пазітыўна адказала толькі 12 асоб.

Іаанна Чабан, жыхарка Крынак, ініцыятарка наладжання ў Крынках навучання беларускай мовы:

— Два гады таму было ахвотных каля 30 дзяцей, настаўніца з Бабік мела вучыць беларускай мове ў Крынках, усё, здавалася, ішло паспяхова. Праўда, мяне тут не было, бо працавала я ў Бельску, а жыла ў Беластоку, таму не магла сачыць за справамі і калі сюды прыехала пасля нейкага часу, аказалася, што няма навучання беларускай мовы.

На сённяшні дзень у крынкаўскай школе, уключаючы дзіцячы садок, вучыцца 321 дзіця, а цэлыя Крынкі налічваюць каля 2,5 тысячы жахароў. Жыдоўскія Крынкі, пра якія найчасцей гаворыцца ў масмедыях і пры іншых нагодах, з’яўляюцца толькі ўспамінам і гісторыяй, якую варта даследаваць. Засталося аднак польска-беларускае суседства, не толькі праз мяжу, якая пралягла ў пару сотнях метраў за Крынкамі. Польска-беларускае суседства жыве і праз плот. Адны гавораць па-польску, другія — па-беларуску, або, як кажуць некаторыя, па-свойму. Няхай і так, але гэтая свойская мова вельмі блізкая беларускай літаратурнай мове. Калі хто не верыць, можа пайсці да пісьменніка Сакрата Яновіча, які жыве ў Крынках. Ён гаворыць на літаратурнай мове, можна ў гутарцы з ім гэта праверыць.

— Дзеці разумеюць, але не гавораць. Цешуся, што мабыць будзе магчымасць вывучаць беларускую мову, — гаворыць адна з жыхарак Крынак, маці двойкі дзяцей. — Ужо два гады таму нашы хацелі вучыцца, можа зараз удасца. Апрача Асі Чабан то ніхто не хацеў заняцца гэтым, гаварылі многа, але ніхто не пачаў, не ведалі ў які бок, а калі ёсць кіраўнік, які падкажа што і як, то лягчэй, зусім інакш. У школе ёсць польская, англійская, а дзе наша мова? Што з таго нямецкага, калі я яго не разумею, затое маё дзіця не ўмее да мяне адазвацца на маёй роднай мове, няхай яны таксама нармальна пагавораць.

**Іаанна Чабан**

— Я не думала, што такія праблемы будуць. Пазбірала подпісы пад петыцыяй, каб мець усё на паперы, больш за дваццаць подпісаў. Я не ведаю людзей у Крынках, бо восем гадоў жыла ў Англіі, каб зарабіць на хату, якоесь месца для жыцця, але ўсё ж такі ведала, што вярнуся, бо тут маё месца. Можа нават гэта нейкая місія — як з гэтай беларускай мовай... Ведаеце, дзеці вадзілі мяне па хатах да бацькоў, самі хацелі дапамагчы, бо ў іх ёсць ахвота вучыцца. Некаторыя падпісваліся рукамі і нагамі, некаторыя казалі, што пашлюць, але не падпішуць, бо іх з работы выкінуць, падпісваліся і каталіцкія, і праваслаўныя сем’і. Першая размова са спадарыняй дырэктар была нават прыемная, надзейная, але кожная наступная зусім іншая. Сказала, што тут непатрэбная беларуская мова, бо тут няма беларусаў. Запытала, ці можа яшчэ кітайскую захочам. Таму я папрасіла пісьмовага адказу. Але ў адказе толькі словы, што няма месца на чарговыя мовы ў школе. Да гэтага адказ пані бурмістр, што не мае закідаў да працы дырэктар Міран.

**Дырэктар Аліцыя Міран:**

— Пані Іаанна вельмі негатыўна ставілася, некультурна са мной размаўляла, „Што вы плецяце” — гаварыла. Можа і я пляту, але думаю, што часцей за ўсё не. Яна амаль накідвала што мне рабіць, закідала антыбеларускасць, а я абсалютна не антыбеларуская, я ездзіла ў Гародню ў час студыяў, сустрэла там шмат цікавых людзей.

— Можа я так і сказала, але проста такі быў узровень дыскусіі, без ніякай пашаны для суразмоўцы, — дае адпор змагарка за беларускую мову.

— Школа гэта не прыватная ўстанова, — у адказ гаворыць спадарыня Міран, — я мушу прымаць рашэнне адносна дадатковых заняткаў на аснове заканадаўства, а не вось так сабе. У мяне 10 дырэктарскіх гадзін, але яны ўжо распарадкаваны. Мы пытаем у анкетах дзяцей чым хочуць займацца і найбольш яны цікавяцца спартыўнымі ды інфарматычнымі заняткамі. Тры гады таму назад я намовіла бацькоў, каб іх дзеці пачалі вучыцца расейскай мове, бо тут блізка ўсходняя мяжа. Па-расейску ўсюды будуць маглі гаварыць, а беларуская толькі Беларусі датычыць. Я кахаю расейскую, беларускую, украінскую музыку, спевы, але не магу нічога рабіць на сілу. На гэты момант мы правялі анкетаванне бацькоў, а яшчэ запытаем дзяцей.

**Метадыст беларускай мовы Іаланта Грыгарук:**

— Паводле дакументаў мне здаецца, што тут было ўсё ў парадку, усё зроблена тэрмінова і ў адпаведнасці з распараджэннем Міністра нацыянальнай адукацыі ад 14 лістапада 2007 года. Маю ўражанне, што ў нейкі спосаб правы бацькоў аднак былі тут парушаны. А наконт дзяцей, то, вядома, маюць права выказвацца, але паводле заканадаўства якраз у справах мовы рашаюць бацькі. Калі дзецям не будзе выгадна, то, вядома, скажуць, што не хочуць. Дзіця павінна гаварыць наконт ходу заняткаў або калі не дае рады, але спачатку трэба пачаць увогуле вучыцца.

Да 12 чэрвеня Кураторыя асветы ў Беластоку забавязала дырэктар высветліць сітуацыю і канчаткова ўстанавіць колькі бацькоў хоча, каб іх дзеці вывучалі беларускую мову. Затым і пазбіраць дэкларацыі бацькоў.

18-е чэрвеня, Кураторыя асветы ў Беластоку

**Дырэктар Францкевіч:**

— Атрымалі мы інфармацыю, што з 96 апытаных бацькоў толькі 9 хоча паслаць дзяцей на беларускую мову: 4 асобы з класаў I-III, 3 з IV-VI ды з гімназіі — 2 асобы. Распараджэнне дазваляе арганізаваць міжкласныя групы ў колькасці 3-14 асоб. А нават калі будзе партрэба — міжшкольныя. Спадарыня дырэктар дэкларуе аднак, што бацькі хочуць, каб іх дзеці ўдзельнічалі ў школьным гуртку.

Размова па тэлефоне з дырэктар Міран:

— Якія рашэнні наконт беларускай мовы?

— *Ідзем у бок гуртка беларускай мовы. Я паінфармавала бацькоў пра магчымасць навучання, папрасіла запоўніць анкету. Толькі 9 асоб выказала зацікаўленне, але не хочуць, каб іх дзеці вучыліся мовы з ацэнкамі як нармальны прадмет. Зараз я накіравала да бацькоў просьбу данесці заявы з інфармацыяй, што дазваляюць, каб іх дзеці вучыліся беларускай мове.*

— Да калі тэрмін данесці заявы?

— *Зараз ужо канікулы, у нас шмат працы на канец года. Буду займацца гэтай справай з 1 верасня. Не маем грошай пакуль на гэты гурток і не маем настаўніцы.*

— Але калі дзеці вучацца беларускай мове, то міністэрства перадае субвенцыю на кожнага вучня.

— *Бацькі не хочуць прадметнага навучання, хочуць, каб дзеці прыходзілі добраахвотна, пагулялі, патанцавалі. Шукаем асобы, якая магла б павесці заняткі 1-2 разы ў тыдзень. Але з верасня будзем правяраць запатрабаванне бацькоў.*

— Яны ж ужо яго выказалі.

— *Але ўжо адмаўляюцца. У мяне ёсць пісьмы. Калі не знойдзем настаўніцы, не будзе гуртка зацікаўлення. А можа пані Іаанна* (Чабан — рэд.) *хацела б прыйсці з раз у тыдзень пагуляць з дзяцьмі?*

— Калі ладзіцца сустрэча за сустрэчай, гэта можа выклікаць нейкую боязь, страх, так у дзяцей, як і ў бацькоў, — каментуе метадыст Іаланта Грыгарук. — Не разумею такога падыходу. Калі звяртаецца да цябе круг зацікаўленых з канкрэтным пытаннем, ты павінен адказаць зацікаўленым, а не пытаць усіх навокал, так як гэта зрабіла пані дырэктар. Яна не правярала, хто першапачаткова падпісаўся пад петыцыяй, якія дзеці хочуць вучыцца, у якім яны ўзросце. Магла сустрэцца са мной, пагаварыць з іншымі, хто вядзе навучанне. Не зрабіла гэтага.

**Перспектывы**

— Беларуская мова не з’яўляецца праблемай, — кажа спадарыня дырэктар, — праблему бачыць пані Іаанна. Прыйшла з вуліцы і проста дамагалася гэтага. Не так даўно нашы настаўнікі ездзілі ў Беларусь, маем дамовы з Малой і Вялікай Бераставіцай, з Пагранічным, былі ў Крушынянах, дзе з візітам былі жанчыны з Татарстана, я сапраўды адкрытая на шматкультурнасць.

На шматкультурнасць таксама былі адкрыты дырэктары школ у Беластоку, дзе бацькі, сёння згуртаваныя ў аб’яднанні АБ-БА, прыходзілі прасіць дапамогі ў стварэнні беларускага навучання. Сустрэчы ўспамінае старшыня Аб’яднання бацькоў у карысць дзяцей і моладзі, якія вывучаюць беларускую мову АБ-БА Барбара Пякарская:

— З перспектывы часу ў арганізацыі беларускага навучання найважнейшая добрая воля дырэктараў і чыноўнікаў. У Беластоку мы прыйшлі да чужога чалавека, да дырэктара Падставовай школы № 4 Збігнева Клімовіча, можна сказаць прыйшлі з вуліцы не заяўляючы нават свайго візіту. Распавялі, чаго патрабуем і спыталі, ці ёсць магчымасць. Гэта была фантастычная справа, бо сказаў: „Калі ласка, калі будуць дзеці і дапаможаце знайсці настаўніцу, бо я ў беларускіх справах зусім не разбіраюся, не бачу праблемы”. Відаць, бачыў карысці, новыя дзеці, новыя ідэі. Першапачаткова не назбіралі нават 7 дзяцей, каб стварыць адзін клас, але ён усё ж такі дазволіў. Прызнаў нядаўна, што сам не верыў у поспех, але ўдалося. Калі ёсць заява ад бацькоў, адна, нават не дзевяць, дырэктар павінен адчуваць патрэбу стварэння такой магчымасці. Калі добрай волі няма, спосабаў, каб знеахвоціць дзяцей і бацькоў, можна знайсці шмат.

Нараўка

## Юбілей гміннага самаўрада

29 мая гэтага года адбылася ўрачыстая сесія Гміннай рады, прымеркаваная да 20-гадовага юбілею гміннага самаўрада ў Нараўцы Гайнаўскага павета. З інфармацыяй пра найважнейшыя гаспадарчыя, інвестыцыйныя і культурныя дасягненні ў Нараўчанскай гміне ў 1990-2010 гадах выступіў сакратар Гміннай рады Міхал Бароўскі.

Старшыня Гмінай рады Андрэй Мядзведзь уручыў званне Пачэснага грамадзяніна Нараўчанскай гміны Аляксандру Бандаруку, старшыні Суполкі з а.а. Будаўнічая кераміка Ляўкова. Такое ж званне атрымаў ужо пасмяротна праваслаўны гайнаўскі епіскап Міран (Хадакоўскі). Дакумент старшыня Гміннай рады ўручыў запрошанай на сесію рады ягонай пляменніцы.

Памятныя статуі з выявай белавежскага зубра былі ўручаны кіраўнікам розных устаноў і гаспадарчых прадпрыемстваў, камендантам паліцыі, пагранічнай аховы і пажарнай каманды, а таксама радным бягучага і папярэдніх скліканняў. Атрымаў яе таксама радны, старшыня Грамадскай і сацыяльнай камісіі Гміннай рады і адначасова ніўскі супрацоўнік Янка Целушэцкі.

З мастацкай часткай выступілі фальклорныя калектывы „Нараўчанкі" з Нараўкі і „Цаглінкі" са Старога Ляўкова.

На заканчэнне юбілейнага мерапрыемства быў наладжаны пачастунак. Сустрэча прайшла ў цёплай, мілай і сардэчнай атмасферы.

## Усё больш пастаянных чытачоў

Сама менш трыццаць чалавек у Нараўчанскай гміне Гайнаўскага павета чытала дваццаты нумар „Ніві". Найбольш іх было ў Новым Ляўкове і ў Плянце — па дзесяць, у Старым Ляўкове — чатырох, у Нараўцы — трох, у Альхоўцы двух ды ў Лешуках, Семяноўцы і Свінароях — па адным. Наш родны часопіс ад дваццатага нумара сталі чытаць Марыя Бяляўская з Нараўкі і Анна Беглюк з Плянты.

Старонкі Ніві" № 21 (ад 23 мая 2010 года) гарталі 35 асоб, у тым ліку ў Новым Ляўкове і ў Плянце — па чатыры, у Альхоўцы — два ды ў Лешуках, Падляўкове і ў Свінароях — па адным. Гэты нумар пачала чытаць Вера Осяк з Падляўкова. І зноў пасля доўгага перапынку. Апрача яе гэты нумар чыталі, між іншым, Віталь Скепка, Мікалай Янкоўскі і Віктар Кабац з Гайнаўкі.

Варта дадаць, што пастаянную падпіску на „Ніву" робяць Яўгенія Аліфер са Старога Ляўкова, Уладзімір Клімюк з Плянты, Яраслаў Харкевіч з Лешукоў, Мікалай Варанецкі з Альхоўкі і Людміла Савіцкая са Свінарояў, а таксама дырэкцыя Комплексу школ у Нараўцы.

**Янка ЦЕЛУШЭЦКІ**

# У дарозе за Янам Тарасевічам

*Айцец У.Місеюк з прыхаджанамі не забываюць пра Яна Тарасевіча*

**Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ**

**Год да пяцідзесяцігоддзя смерці кампазітара Яна Тарасевіча на яго магіле ў Саколцы яшчэ раз айцец Уладзімір Місеюк з парафіянамі адправіў паніхіду. Ян Аляксеевіч нарадзіўся 23.09.1889 года ў Саколцы ў сям'і царскага падпалкоўніка. Тарасевіч закончыў аддзел фартэпіяна ў Пецярбургскай кансерваторыі (1912), быў вучнем прафесараў Мікалая Абрамычава і Язафа Вітольса. Чакала яго выдатная кар'ера як музыка, але лёс маладога кампазітара склаўся зусім інакш. Пакінуў пасля сябе больш за сто песень і інструментальных фартэпіяннавакальных твораў. Ён выхаваў як мінімум чатырох прафесараў Варшаўскай акадэміі музыкі і самага вядомага сёння дырыжора Ежы Максымюка. Ян Тарасевіч быў першым, хто напісаў музыку да вершаў Францішка Багушэвіча, Максіма Багдановіча, Якуба Коласа. Ян Тарасевіч вучыў ігры на піяніна ў школах у Гродне, Саколцы і Беластоку. Наведвалі яго вядомыя кампазітары Рахманінаў ці Сібэліус. У Беластоку ён быў амаль невядомы. Памёр 18 чэрвеня 1961 года і пахаваны на сакольскіх могілках.**

— Якая радасць пабачыць нас над магілай спачылага кампазітара, якога памяць была столькі часу ў забыцці, — айцец Уладзімір з парафіянамі не забываецца пра гадавіну смерці Яна Тарасевіча і штогод моліцца за яго душу і душы ягоных *сроднікаў*. — Нікога ў яго не засталося. Сёння — паглядзіце: як Гасподзь учыніў, што сабраліся сюды людзі, каб памаліцца за яго душу, мастацкую, заўсёды поўную музыкі, а калі ў сэрцы музыка — там і анёлы спяваюць. Мы сёння прыйшлі, каб прадоўжыць песню анёлаў. Доўгі час сюды толькі птушкі заўжды прыляталі, каб яму вечную памяць праспяваць. Такога месца і шукала яго спакутаваная душа. Гасподзь дае час для тых, што застаюцца, каб умелі ў нашых продках знайсці тое, што самае светлае, шчырае, дарагое. Цяпер, дзякуючы ўспамінам пра яго запісаным Ганнай Кандрацюк, можам даведацца пра ягоныя добрыя ўчынкі, пра талент, даведацца, якім быў чалавекам, пра яго адносіны да наваколля. Наваколле яму пры жыцці не аддзячыла. Цяперашняя нашая служба з'яўляецца таксама просьбай за душу спачылага, але і просьбай прабачэння за тое, якімі мы бываем няўдзячнымі. Памяць аб спачылым расходзіцца. Штогод магло б быць да гэтага месца маленькае паломніцтва, якое сведчыла б аб тым, што гэты чалавек заслужыў не толькі на нашую, чалавечую, але і вечную памяць.

На сустрэчы над магілай з парафіянамі-харыстамі і ў Крынках даследчыца ягонага жыцця і творчасці Ганна Кандрацюк падзялілася сваімі роздумамі. Публікацыі Ганны Кандрацюк, якія ў частках друкаваліся ў „Ніве" з 1994 г., пасля перакладзены на польскую мову, паўплывалі ў значны спосаб на пашырэнне зацікаўлення творчасцю кампазітара. Пачынаючы з 1997 г. яго творы рэгулярна паяўляюцца ў праграмах беларускіх выканаўцаў. 29 кастрычніка 1999 г. у Мінску адбыўся трохгадзінны канцэрт, поўнасцю прысвечаны музыканту з Саколкі, запісаны пазней на дыску выдадзеным у 2001 годзе. Пасля выхаду ў 2002 г. кнігі Ганны Кандрацюк „W stronę Tarasiewicza" (другое выданне ў 2004 г.) узнік фільм Юрыя Каліны „Jan Tarasiewicz — kompozytor zapomniany". У тым самым годзе па ініцыятыве Беларускага гістарычнана таварыства і Беларускай капэлы выйшлі нотныя творы пад рэдакцый прафесара Ігара Алоўнікава „Песні кахання". Ежы Максымюк напісаў сімфонію „Арбор" і прысвяціў яе Яну Тарасевічу. У 2008 г. Гарадская рада Саколкі прысвоіла новай вуліцы (што стыкаецца з дарогай на Шындзель) імя Яна Тарасевіча. У 2009 г. моладзь з Саколкі і Маладзечна рэалізавала тэатральна-музычны праект, прысвечаны Яну Тарасевічу „На крыллях музыкі". Вучні мясцовай школы працягваюць даследчыцкую працу, дзелячыся сваімі знаходкамі на адмыслова створаным інтэрнэт-сайце.

Над магілай маліліся за ўпакой душ герояў кнігі, якіх лёсы звязаны з асобай кампазітара і яго спадчынай, спадарожнічалі даследчыцы ў адкрыванні забытага беларускага кампазітара. Рашучая доля ў адкрыцці музыканта належыць Анатолю Чарапінскаму з Любліна, сябру і выхаванцу музыканта, лекару псіхіятру і гісторыку мастацтва — ён захаваў творы, дакументы, сямейныя фатаграфіі. Дзякуючы яму даведаліся пра кампазітара з Саколкі ў Мінску ў 1993 г., у сотую гадавіну ад нараджэння і 32 гады пасля смерці кампазітара. У лістападзе 1997 г. была знойдзена ягоная магіла на праваслаўным могільніку ў Саколцы. Вясной 1998 г. даследчыца першы раз наведала Шындзель — месца, дзе жыў кампазітар. Хадзіўшы яго следам, у натхненні ягонай музыкай, склала мазаіку жыццёвага шляху Тарасевіча.

Па словах Ганны Кандрацюк, праз год на сакольскіх могілках па ініцыятыве неабыякавых людзей трэба будзе на магіле кампазітара паставіць новы помнік:

— У сувязі з тым, што праз год будзем адзначаць 50 год з дня ягонай смерці, хочам аднавіць гэты надмагільны помнік. Будзем гаварыць з уладамі Саколкі, будуць таксама грамадскія ініцыятывы — думаю, што дапамогуць нам людзі з Гродна. Мы знаёмыя з гродзенскім мастаком, майстрам кавальства, і думаем, каб зрабіў ён праект у стылі канца XIX стагоддзя. Свята хочам адзначыць таксама канцэртам у Беластоцкай філармоніі.

Сустрэча Ганны Кандрацюк у Крынках, з паказам фільма Юрыя Каліны „Jan Tarasiewicz — kompozytor zapomniany", завяршылася канцэртам і гарачай дыскусіяй на тэму культуры і ролі таленавітых мастакоў у жыцці такіх „забытых" правінцыйных мясцовасцей як Саколка ці Крынкі. Прынялі ў ёй удзел, між іншым, жанчыны, якія заснавалі музычны калектыў „Сугучча" і Сакрат Яновіч. Удзельнікі дыскусіі горача спрачаліся з пісьменнікам, „галоўным крынкаўскім правакатарам", які паказвае стан беларушчыны на Падляшшы і не толькі тут адно ў чорных колерах. Вось бацькі стараюцца аднавіць беларускую мову ў школе ў Крынках, узнік дасканалы фальклорны гурт, які з поспехам заваёўвае сэрцы слухачоў. Такія асобы, таленавітыя і руплівыя працаўнікі роднай культуры і асветы як Ася Чабан і яе сяброўкі, матушка Людміла Клімук з Вострава, спявачка Кацярына Дмітрук-Алексяюк вельмі ж горача пярэчаць чорным Сакратавым думкам. І хоць сустрэча была звязаная з гадавінай смерці кампазітара, якога жыццё было трагічным, і завяршылася яшчэ доўгімі начнымі размовамі і спевамі аж пад Востравам, засталася яна ў памяці з нейкай нотай аптымізму: *Ніжа спакойна час разарваны гадзіннік веку. Твой плён сабраны.*

*Сакрат Яновіч і Ася Чабан (у цэнтры) думаюць пра беларушчыну ў Крынках*

*18 чэрвеня асацыяцыя АБ-БА наладзіла сустрэчу з* ***д-рам Юрым Туронкам*** *на тэму міфаў і беларускай рэальнасці ў Другую сусветную вайну. Вёў сустрэчу рэдактар Мікола Ваўранюк, які напачатак сказаў:*

Тэкст і фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

# Праўда і міфы пра вайну

Юры Туронак асэнсаваў месца Беласточчыны ў агульнабеларускай гісторыі, але таксама і ў шырэйшым спектры. Колькі ж было ў свой час шуму вакол ягонай кніжкі „Беларусь пад нямецкай акупацыяй" — ягонай доктарскай дысертацыі. Перш-наперш у г.зв. другім (падпольным) абароце, у незалежнай польскай прэсе яшчэ пры камуністах — так тады пра гісторыю Другой сусветнай вайны ніхто не пісаў. Дарэчы, і цяпер у Беларусі рэдка дзе такое прачытаеш. Мы назвалі нашу сённяшнюю сустрэчу „Міфы і рэальнасць Другой сусветнай вайны". Чаму так? Таму што якраз у Беларусі, як у ніводнай іншай еўрапейскай краіне, тых міфаў пра вайну назбіралася вельмі многа. Я годам раней быў на святкаванні Дня Рэспублікі, Дня Незалежнасці, прымеркаваных цяпер да вызвалення Мінска, да 3 ліпеня. І я памятаю, як у школе мяне вучылі, што загінуў кожны чацвёрты беларус. Цяпер, 65 гадоў пасля вайны, кажуць, што кожны трэці — колькасць тых ахвяр вырасла значна; гэта адзін з міфаў. Прапаную слова нашаму госцю; не будзе тут акадэмічнага даклада, толькі дыскусія на цікавыя нам тэмы, але, будучы яшчэ пры слове, хачу запытацца, чаму ў Беларусі столькі міфаў, чаму там тая вайна ўсё не можа закончыцца да сённяшняга дня, калі нават Расія, якая прыняла „ўласаўскі" сцяг і якая адзначае дні 9 мая ці 22 чэрвеня, але не кожны дзень там пра тую вайну згадваецца. А Беларусь жыве вайной. Нават цяпер, калі Масква напалохала Аляксандра Лукашэнку санкцыямі за незаплачаны доўг за газ, то ён узгадаў Брэсцкую крэпасць і тое, што „мы былі там разам з Расіяй" — чаму якраз тая вайна не можа закончыцца ў Беларусі?

Спадар Ваўранюк узняў адразу мноства пытанняў, — сказаў Юры Туронак. — Сапраўды, мая згаданая кніжка была маёй доктарскай дысертацыяй. Прыйшла тады да мяне студэнтка Варшаўскага ўніверсітэта і паціху спытала, ці я згадзіўся б выпусціць гэтую кніжку ў другім абароце, тады яшчэ нелегальным. Я адразу згадзіўся і пачалася работа. Выдавецтва „WERS" было тады нелегальнае і падрыхтавала маю кніжку так, як і ўсе іншыя нелегальныя выданні, але выйшла яна на схіле 1989 года, калі ўжо развалілася камуністычная сістэма і калі гэтае выдавецтва было ўжо зарэгістраванае і такім чынам кніжка пайшла легальным шляхам. І хаця годам выдання названы 1989-ы, я яе атрымаў толькі ў лютым 1990 года.

Цяпер пра міфы. Чаму ўсюды ўжо забыліся альбо забываюцца пра Другую сусветную вайну, а ў Беларусі памяць пра яе жыве? Гэта не таму, што там было столькі ахвяр, але таму, што там, як нідзе больш, выступаюць дзве праўды: адна праўда фактычная, гістарычная, з якой не можа пагадзіцца ўлада, якая мае сваю палітычную праўду. І ў сувязі з тым усе даследаванні, якія не адпавядаюць палітыцы ўлад, лічацца афіцыйна непрымальнымі. Аднак гэта не ўплывае на адмову даследчыкаў ад тэмы — якраз наадварот: калі нешта, што можна даказаць дакументальна, забараняецца альбо аспрэчваецца, толькі ўзбуйняе зацікаўленне гэтай праблемай. Я асабіста з прыемнасцю наглядаю, што шораз больш маладых людзей займаецца вельмі сур'ёзна — без ніякай прапаганды — пытаннямі Другой сусветнай вайны. Спадзяюся, што прыйдзе час, калі знікне гэтая супярэчнасць паміж палітычнай і фактычнай праўдамі.

Прывяду яшчэ адзін прыклад — вось такая Польшча ў эпоху майго пакалення ўзнімала тэзіс, што яна без Квіслінгаў, без дзяржаўных здраднікаў; так мы думалі. І гэтае пытане мяне асабліва не цікавіла, але прыглядаўся, калі нешта такое ўсплывала ў прэсе. І было, што быў у 1930-я гады такі прэм'ер польскага ўрада, Казлоўскі, які запрапанаваў немцам стварыць польскі ўрад падпарадкаваны Берліну, але нямецкія ўлады зусім не захацелі з ім гаварыць. І яшчэ: Цат-Мацкевіч, які быў прэм'ерам польскага эмігранцкага ўрада ў Лондане, як паказваюць цяпер ускрытыя архівы нямецкага Міністэрства замежных спраў, прапанаваў зараз пасля капітуляцыі Францыі ў 1940 годзе, што ён з групай прыхільнікаў гатовы стварыць польскі ўрад таксама падпарадкаваны немцам, але нямецкія ўлады не захацелі пра гэта з палякамі гаварыць.

Як бачна, міфаў маса; я нават падумоўваю пра напісанне брашуры па гэтым пытанні. Як у Беларусі сур'ёзныя людзі, прафесары, фальшавалі факты.

Я закрану пасляваенную рэчаіснасць, новы перадзел Еўропы пасля разгрому Нямеччыны ў 1945 годзе, якая прынесла савецкую дамінацыю на абшары Усходняй Еўропы. І тут усё адбывалася са згоды саюзнікаў, якія тады былі ў вялікай дружбе з Савецкім Саюзам. Пасля было ідэалагічнае супрацьстаянне, якое прыкрывала імперскія памкненні Савецкага Саюза і Злучаных Штатаў Амерыкі. У той час адвакатам беларускай справы не была ні Амерыка, ні Польшча, ні ніякая іншая еўрапейская краіна, толькі Масква. Гэта з яе ініцыятывы Беларусь выйшла на міжнародную арэну, стаўшы членам Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, хутчэй за Польшчу — гэта Беларусь прымала Польшчу ў ААН. Аднак гэта была фікцыя, якая не давала ніякага канкрэтнага выніку. Мала таго, у Беларусі акрамя эканамічнага прагрэсу і ў нейкім сэнсе культурнага, адначасова праходзіла страшэнная русіфікацыя і саветызацыя без эфектыўнага супрацьстаяння.

Далей наступіла вельмі цікавая эпоха Гарбачова. Яго ідэі перабудовы і галоснасці вельмі ахвотна ўспрымаліся на Захадзе і адкрывалі нейкія новыя магчымасці ў суадносінах Усход-Захад. Але пры ўсёй г.зв. дэмакратызацыі Гарбачоў ніколі не выказаў згоды на аддзяленне Прыбалтыкі ці Грузіі ад Савецкага Саюза, якіх насельніцтва ў рэферэндуме 1990 года выказалася супраць прабывання ў складзе СССР. Гэта выклікала вялікае хваляванне ў Літве. І я ведаю, што ў 1990 годзе дэлегацыя літоўскіх дзеячаў выехала ў Вялікабрытанію, Францыю і Злучаныя Штаты прадставіць сваю пазіцыю ў справе незалежнасці і прасілі дапамогі. Там іх прымалі, але нічога не абяцалі; гэта выклікала вялікае расчараванне, адчай, што Захад не хоча іх падтрымаць.

Адносна становішча Беларусі ў міжнародным аспекце: дзяржаўная незалежнасць не атрымліваецца ў падарку, яе здабываецца. У гэтым выпадку яе не здабывалі. Абсалютна дэмакратычныя рэферэндумы 1990 і 1991 гадоў паказалі, што пераважная большасць насельніцтва Расіі, Беларусі і Украіны была за захаваннем Савецкага Саюза — яны не хацелі ствараць сваіх незалежных дзяржаў. Незалежнасць, якую мае Беларусь, атрымалася ў выніку ініцыятывы Масквы — не з Варшавы яна з'явілася, не з Берліна, не з Вашынгтона, але з Масквы; і то нягледзячы на тое, што большасць насельніцтва была супраць — за незалежнасцю была меншасць, якою сталі нацыянальна свядомыя беларусы.

*(працяг будзе)*

## Сведкі мінулага

Жыхар вуліцы Фабрычнай у Чаромсе Веслаў К. рабіў парадкі на паддашку. У мностве старых рэчаў знайшоў керамічны посуд з саракавых гадоў. На соўсніку знаходзіцца штамп з нямецкай эмблемай Gchönwald 1935, на такім жа соўсніку, але іншага тыпу — TIELSCH-ALTWASSER 1941, а на супніцы — H. U. Bohemia 1940. Усе рэчы знаходзяцца ў належным стане і шыкарна прэзентуюцца. Адкуль яны знайшліся на кватэры, цяжка сказаць, паколькі гаспадары даўно памерлі, а маладыя нічога не ведаюць. Са штампаў на посудзе няцяжка здагадацца, што гісторыя тычыцца міжваеннага часу і другой сусветнай вайны. Вось што сказаў мне 79-гадовы чарамшанін Вальдэмар Бычкоўскі.

Фота аўтара

*Нямецкі посуд*

— Калі праходзіў фронт і гітлераўцы наступалі на ўсход, дык у ляску побач насычальні сарганізавалі базу для забеспячэння войска (у саракавым годзе складамі, якія называліся „Нефтестрой", карысталіся рускія і служылі для забеспячэння ваеннага гарадка ў Кузаве).

Немцы ваенныя пастаўкі атрымлівалі з захаду. Груз паступаў эшалонамі. Разгрузкай займалася мясцовае насельніцтва. Солтыс — Мотыль, здаецца, тады ім быў — вызначаў людзей на работу. І мяне выклікаў. Памятаю як разгружалі цукар. „Галушкі" велічынёю чалавечай галавы былі. Транспарт прыслалі з Украіны. На базе знаходзілася вопратка, бялізна, посуд і ўсё астатняе неабходнае салдатам на фронце. Пасля наймалі сталых рабочых. У час адступлення немцаў ніхто за базай не наглядаў. Маёмасць пачалі грабіць жыхары навакольных вёсак. Многія чарамшане тады нажыліся...

Гэты факт пацвярджае мой другі субяседнік, купец з Бельска-Падляшскага, які займаецца скупкай і продажам старых рэчаў на рынку. Калі я расказаў яму пра нямецкі посуд, дык той заявіў без запінкі: «Прывозьце, куплю. Добра заплачу». А калі я адмовіўся, дык дадаў: «Я такі соўснік ад чарамшука са Школьнай купіў, а талерку — ад жанчыны з-пад вадакачкі. Штамп быў з 1942 года. Здаецца, што гэтыя рэчы выходзяць з адной і той жа крыніцы», — заявіў купец.

Прыпамінаецца мне публікацыя з „Газэты вспулчэснай" ад 5 красавіка 2002 года «Tajemnica przykryta ziemią (Co od ponad 50 lat leży w lesie pod Czeremchą?)» аўтарства Анны Мяжынскай. Журналістка пісала аб знаходцы ў чаромхаўскім лесе шматлікай колькасці кубікаў, велічыні пачка запалак, напамінаючых мыла. Некаторыя тады тлумачылі, што пад Чаромхай немцы займаліся вытворчасцю мыла... з людзей. Справай займаўся ІПН, але афіцыйнага выніку ў гэтай справе не было. Вядома, што ў гэтым месцы знаходзіліся нямецкія склады, на якіх захоўвалася не толькі мыла, але і іншыя рэчы, неабходныя салдатам на рускім фронце. Да складоў падвозілі запасы ваганеткамі вузкакалейкі. Пасля таго, як немцы пацярпелі паражэнне на ўсходнім фронце, чаромхаўскія склады пацярпелі ад пажару. Але што было яго прычынай ніхто са старажылаў пасёлка не можа сказаць.

**Уладзімір СІДАРУК**

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

З★рка

для дзяцей і моладзі

# БЕЛАВЕЖСКАЯ ПУШЧА: РЭПАРТАЖ ПРА ЛЮДЗЕЙ ПУШЧЫ

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Сара Кос (справа) і Патрыцыя Нармантовіч

*Пад такой шыльдай адбыліся XXIV Сустрэчы „Зоркі” і можна сказаць, што былі яны тэматычным працягам папярэдніх 23-х майстар-класаў. Год таму мы менавіта знаёміліся з Белавежскай пушчай праз прызму літаратуры, фільма, шляхам краязнаўчых вандровак ды аповедаў запрошаных людзей. Аначасова вучыліся мы многім жанрам журналістыкі.*

У гэты раз мы засяродзіліся на рэпартажы. Як вядома, гэты жанр неразлучны з дарогай. З дарогай, якая вядзе да чалавека. Нам пашанцавала выйсці да людзей, пазнаёміцца і пагутарыць пра іх радасці і праблемы. Нашы героі, як самі пабачыце, не толькі расказалі аб жыцці і працы, але і падзяліліся з намі сваімі сакрэтамі і марамі. Частку жыцця пушчанскіх людзей мы пабачылі на канкрэтным прыкладзе. Разам з гаспадыняй мы спяклі жытні хлеб (прапанова для дзяўчат), які пасля смакаваў асабліва мужчынскай частцы нашага летніка. Нашы хлопцы, раней чым напісаць рэпартаж пра пушчанскі транспарт, навучліся запрагаць і распрагаць каня. Мы мелі нагоду пабачыць як выглядае духоўнае жыццё пушчанскіх людзей. Разам з імі мы пабывалі на акафісце да Маці Божай ля жыватворнай крыніцы ва ўрочышчы Кудак. У гэтае натхняльнае месца запрасіў нас сам айцец Гаўрыіл, якія пасля багаслужбы сустрэўся з нашымі журналістамі. Праз два дні мы наведалі царкву ў Ляўкове, дзе частка сустрэчнікаў спявала ў прыхадскім хоры, назірала як жанчыны асвячаюць зёлкі (якраз выпаў Зелянец) і паводзяць сябе ў падобных месцах. Грамадскія сувязі людзей пушчы — тэмарака для рэпартажу!

Як год раней, мы працавалі і адпачывалі ў гасцінным пансіянаце „Бора-Здруй” у Новым Ляўкове. Разам з дзяцьмі і моладдзю працавалі журналісты і пісьменнікі: Міра Лукша, Яўген Вапа, Міхась Сцепанюк і нізэйпадпісаная. На працягу тыдня нас наведалі госці: фатограф Андрэй Лянкевіч, журналіст і краявед Янка Целушэцкі, літаратар Міхась Андрасюк, пешаход-рэпартажыст Аляксандр Вярбіцкі, этнолаг Эва Мароз-Кечынская, навуковы супрацоўнік і эколаг Андрэй Кечынскі. Усе моманты Сустрэч адлюстраваныя ў разнавідных жанрах. У выніку працы дзвюх рэдакцый: „Пружына” (пад кірункам Магдаліны Панасюк) ды „Цікаўнасць” (пад кірункам Лукаша Зіневіча), узнікла дзевяць рэпартажаў, сем інтэрв’ю, пяць фельетонаў, тры апавяданні, вершы, ньюсы, рубрыкі гумару і сатыры. Вялікай нечаканасцю для „кадры” была тэатральная п’еса, якую напісалі, паставілі і выканалі самі ўдзельнікі Сустрэч. Іх спектакль быў свайго роду інтэлігентным адказам на ўсе дыдактычныя гутаркі з боку апекуноў і рыхтаваўся ў сакрэце да моманту прэм’еры! Не менш імпазантна выглядае праца сустрачанскіх фатографаў, якія злавілі і ўвекавечылі для хронікі ўсе афіцыйныя (ды не толькі) моманты. Паколькі большасць матэрыялаў надрукуем у „Зорцы”, чытач сам ацэніць нашу ангажаванасць і творчыя праявы. XXIV Сустрэчы „Зоркі” — наш юбілей. У гэтым годзе нам спаўняецца 15 рэальных гадоў! Доўга гэта ці коратка? Частковыя вынікі паказаў сам час. Сярод апекуноў працаваў выпускнік Сустрэч „Зоркі” Міхась Сцепанюк — беларускі журналіст, настаўнік іспанскай мовы, старшыня Звязу беларускай моладзі...

А ці 15 гадоў — шмат часу?

Так. Асабліва для часткі сёлетніх сустрачан, якім яшчэ трэба шмат перайсці да такога ўзросту. Сустрэчы „Зоркі” адбыліся з 8 па 14 чэрвеня г.г. дзякуючы фінансавай падтрымцы Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі.

**Ганна КАНДРАЦЮК**

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

# Вада гэта жыццё!

Кладка ў Кудак

Ну і паехалі! Куды? Мы і самі не ведалі, нам толькі сказалі, што гэтае месца называецца Кудак і яно важнае для праваслаўных людзей. Мы ехалі дыліжансам запрэжаным у трактар больш за гадзіну.

Калі мы былі на месцы, аказалася, што мэта нашай паездкі — вёска Адрынкі. Там падмоклая зямля. У святое месца Кудак вядзе доўгая 800-метровая драўляная кладка. Трэба сцерагчыся, каб не закружылася ў галаве і не ўпасці ў ваду.

На востраве стаяць дзве капліцы. Пасярэдзіне выспы расстаўлены белы намёт, у якім адпраўляюцца багаслужбы. Крыху далей, пад дубамі, зроблены фундаменты пад новую царкву. Тут пабачым і маленькі домік айца Гаўрыіла зроблены з вагона. Побач будуецца новы скіт, у якім будуць жыць манахі-пустэльнікі. У шэсць гадзін вечара пачалася багаслужба, а пасля акафіста асвяцілі ваду.

Нягледзячы на многіх людзей, якія ўсё падыходзілі да айца Гаўрыіла, нам удалося з ім пагаварыць. Ён адразу запрасіў нас частавацца супам і зёлкавай гарбатай. Востраў Кудак купілі пяць гадоў таму, а айцец Гаўрыіл тут ужо два з паловай года. Ён цешыцца, калі да яго прыязджаюць людзі:

— Вялікае значэнне для вернікаў мае малітва да Божай Маці, — кажа. — Мы молімся да Божай Маці, каб яна намі апекавалася і сцерагла ад дрэнных спраў і людзей.

— А якое значэнне мае асвячэнне вады? — спыталі мы ў айца Гаўрыіла. Якраз у дзень нашай вандроўкі выпала свята Пяценка і пасля акафіста духавенства асвяціла ваду. Людзі налівалі яе ў бутэлькі і везлі дамоў.

— Вада мае вялікае значэнне, — кажа манах. — Вада гэта жыццё!

**Сара КОС**
*„Пружына”,*
*I клас гімназіі ў Нарве*

* * *

Ціха ў вянок плятуцца арэшнік, валошкі, рамонкі.
Касачы залатыя галовы палошчуць у праменні.
Корань дуба звязвае моцна глебу роднай старонкі.
Птушка кранае крылом чало чалавека ў маленні.

Чуеш, як кропля з цела майго ў тваё пералівается, тчэцца.
Тчэцца хвіліна ў лёсах тых што ступаюць сюдою.
Збавіць ад болю, тугі іншы боль і сум, што ўзіраецца ў вечнасць.
І невядома калі станем мы таксама вадою.

*11-13.06.2010 г., Кудак*
**Міра ЛУКША**

# Людміла і Барыс

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

*Усе ведаюць, што каханне — вельмі дзіўнае пачуццё. Яно заўсёды прыходзіць нечакана, а калі мы чагось моцна прагнем, так і дзеецца. Мае героі закахаліся ў сабе з першага погляду. Людміла і Барыс Казлоўскія — зусім звычайныя людзі, якія разам з дзяцьмі і бацькамі вядуць аграгурыстычную гаспадарку на хутары Лазовае ў Новым Ляўкове. У месяцы маі, дваццаць сем гадоў таму, у вёсцы Ласінка на забаве, якую зладзілі на парафіяльнае свята Юр'я, танцавалі Людміла са сваёй сяброўкай і невядомы ёй яшчэ Барыс. Раптам па сяброўку Люцыну, бо так называлі Людмілу, калі яна была паненкай, падышоў кавалер і папрасіў да танца. Разам з ім быў калега, будучы муж маёй гераіні. Людміла і Барыс сталі насупраць сябе, нечакана іх позіркі сустрэліся, рукі дакрануліся, а ў галаве мільганула думка: гэта мая любоў! Танцавалі разам усю ноч. Пасля забавы хлопцы прапанавалі адвезці дзяўчат на роварах у іх вёску, але яны адмовіліся і ад'ехалі на фурманцы, якую спынілі па дарозе. Гаспадар ехаў у Дубіны, каб давесці сваю кабылку на расплод. Дзяўчаты селі ў воз і вярнуліся ў іх родную вёску Пасталова, пад пушчай. Перад расстаннем Людміла запісала імя Барыс на руцэ, а калі вярнулася дахаты, сказала маме, што пазнаёмілася з цудоўным хлапцом. Яшчэ на забаве яна запрасіла яго на свой дзень нараджэння, які выпадаў праз два тыдні. Ішлі дні, закаханы хлапец так засумаваў, што пачаў шукаць сваёй дзяўчыны з забавы. Для яе пераадолеў на роварах трыццаць кіламетраў. Калі яна нечакана пабачыла яго каля сваёй хаты, тыдзень да свайго свята, яна зразумела, што гэта сапраўднае пачуццё.*

*— Мы хадзілі з сабой толькі паўгода, — успамінае Людміла.*

*Пасля разам паехалі на экскурсію ў Аўгустова, дзе малады кавалер зразумеў, што час прызнацца ў каханні. Купіў ёй сярэбраны пярсцёнак і зрабіў шлюбную прапанову. Гэта быў адзіны з найшчаслівейшых дзён іх жыцця. Адразу пасля вяртання з экскурсіі яны запланавалі шлюб. 23 кастрычыніка Людміла і Барыс сталі перад Богам і прысягнулі сабе вернае каханне і сумленнасць. З іх вялікай любві нарадзіліся тры дачкі. А іх чацвёртае дзіця — пансіянат „Бора Здруй". Яны спалучылі свае зацікаўленні і сталі неразлучнымі ў жыцці і працы. Перад імі 28-я гадавіна шлюбу, а іх каханне заўсёды яркае і моцнае, як у час першага спаткання. Гэта адчуваецца ў іх усмешках і маладым выглядзе.*

**Лукаш ЗІНЕВІЧ**
„Цікаўнасць", III клас гімназіі ў Гарадку

# Назіраю як жыве натуральны лес!

***Журналісты газеты „Пружына" размаўлялі з Андрэем Кечынскім — чалавекам, які працуе ў Белавежскім нацыянальным парку, госцем 24-х Сустрэч „Зоркі".***

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

***Пружына:*** *— Як Вы адчуваеце сябе ў лесе?*

***Андрэй Кечынскі:*** — У лесе я адчуваю сябе вельмі добра. Калі пайду ў лес, магу там сядзець увесь дзень. Пабыўка ў лесе абвастрае слых і зрок. Я люблю хадзіць па лесе адзін, таму што тады я магу падумаць, засяродзіцца. Я люблю адкрываць для сябе Белавежскую пушчу. За першыя гады работы я думаў, што ўваходжу ў першабытную пушчу, але з часам аказалася, што па-за запаведнікам пушча не існуе.

*П: — Чым Вы канкрэтна займаецеся ў Белавежскай пушчы?*

АК: — Я займаюся даследаваннем лесу, назіраю як жыве натуральны лес, якія там адбываюцца змены.

*П: — З-за якога звяра ў Вас былі праблемы?*

АК: — Аднойчы я прыйшоў у лес і паставіў слупкі, каб весці доследы. Калі скончыў, вярнуўся да першага слупка і там пабачыў, што на ім стаіць зубр. Я спрабаваў яго прагнаць, але звер не рэагаваў на мяне. На шчасце мне ўдалося зрабіць памеры.

*П: — А Вы маеце любімыя месцы ў Пушчы?*

АК: — Калісь я меў такія месцы, аднак цяжка да іх дабрацца. Часам ідзецца праз балоты, ваду ды трэба пераадолець іншыя цяжкасці. Я проста люблю цэлы лес.

*П: — Як Вы дбаецце аб лес?*

АК: — Як дбаю? (*смяецца*). Аднойчы я меў такую гісторыю. Калі я ішоў праз лес, пабачыў, што на дарозе ляжыць памёт. Я згарнуў кучку ў пластмасавы пакет і выкінуў. Збіраю таксама смецце. Часам выходжу з лесу з мяшком смецця.

*П: — Чаму гарадскі чалавек з цэнтральнай Польшчы прыехаў жыць у лес?*

АК: — Калі я вывучаў лясніцтва, я прыехаў у Белавежу на практыку. Белавежская пушча захапіла мяне з першага погляду. Пасля я пазнаёміўся з маёй будучай жонкай Евай і так атрымалася, што астаўся тут жыць.

**Інтэрв'ю, падрыхтаванае рэдакцыяй „Пружыны",**
**апрацавалі:** Магдаліна ПАНАСЮК **(II клас белгімназіі ў Гайнаўцы),**
Наталля ПАПЛАЎСКАЯ **(VI клас ПШ у Залуках),** Патрыцыя НАРМАНТОВІЧ **(V клас ПШ у Бабіках)**




1) Чалавек, які калекцыяніруе напр. паштовыя маркі
2) Жанр карціны
3) Орган вонкавы чалавека
4) Прылада для рыбалоўства
5) Установа, якая характарызуе горад
6) Памяшканне ў хаце
7) Дзіця, у якога няма бацькоў
8) Чорна-белая птушка
9) Орган унутраны чалавека, які моцна б'е
10) Адно з пачуццяў. Супярэчнасць туй

Ула Бэрэзовец *„ЦІКАЎНАСЦЬ"*

# Ці я сапраўдны капітан?

*(з цыкла: гульні і забавы пушчанскіх дзяцей — паводле расказу майго бацькі)*

*Мал. Лукаша Зіневіча, IV кл бельскай „Тройкі"*

Вясна гэта чаканы, але таксама небяспечны час. Чаму? Таму, што часта здараюцца паводкі. Каля маёй хаты ў Доўгім Бродзе знаходзіцца луг, які называюць *Глобучка*. Вясной *Глобучку* часта залівала. Аднаго разу я падумаў, што добра будзе пагуляць у капітана. Я і мае малодшыя браты Янак (5 гадоў) і Юрак (3 гады) узялі балею і два патыкі, каб можна было чымсьці адпіхацца. Мы пусціліся на ваду і паплылі. Мы думалі, што гэта будзе добрая забава. Хутка я зразумеў, што нас занесла трыста метраў ад хаты. Пачалі крычаць! Наша бабуля Оля была ў хаце, але яна нас не пачула. Бацькоў таксама не было, бо паехалі ў Гайнаўку. Баба Оля пачала хвалявацца і сама пайшла шукаць нас. На шчасце мы зачапіліся за купіну дрэва сярод вады. Мы смяртэльна напалохаліся і думалі, што патопімся. Але калі ўбачылі як у наш бок ідзе баба Олька, крыху ачунялі. Яна была нізкага росту. Калі нас пабачыла, яна затачыла спадніцу, прайшла праз ваду і пацягнула на бераг наш карабель. Я ўжо ніколі не хацеў быць капітанам, а гэтую гісторыю буду памятаць усё жыццё.

**Дар'я ВАПА**
„Пружына", VI клас ПШ № 4 у Беластоку

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

# Выбарчая кветка рамонка

Больш за трыццаць маладых назіральнікаў, галоўным чынам беларусаў, але і родам з Літвы і Швецыі, назіралі за першым турам прэзідэнцкіх выбараў у Падляшскім ваяводстве. Падзеленыя на дзесяць груп, наведалі каля дзвюхсот сядзіб выбарчых камісій ва ўсім рэгіёне. „Ніва" спадарожнічала тройцы з іх у Беластоку і некалькіх мясцовасцях Гайнаўшчыны.

Ездзілі мы разам з 26-гадовай Настассяй, якая працуе ў адной з мінскіх фірмаў, 22-гадовым Максімам, студэнтам III курса юрыдычнага факультэта Еўрапейскага гуманітаранага ўніверсітэта (ЕГУ) у Вільні (перанесенага туды пасля роспуску гэтай мінскай вучэльні адміністрацыяй Аляксандра Лукашэнкі) ды шэфіхай гэтай групы, наймаладзейшай з іх, 19-гадовай Алінай, студэнткай II курса факультэта журналістыкі і рэлігіязнаўства ЕГУ.

— Я ў гэтай групе наймалодшая, але ў мяне найбольшы стаж у якасці назіральніка выбараў. Я ўжо ўдзельнічала ў парламенцкіх выбарах у Нарвегіі, прэзідэнцкіх у Літве і мясцовых у Беларусі. Найгоршыя ўспаміны ў мяне з красавіцкіх беларускіх выбараў. У выбарчых участках быццам бы цешыліся, што паявіліся назіральнікі, але нават не дазволілі падысці бліжэй чым на дзесяць метраў да непасрэднага месца галасавання. І найгоршым было тое пачуццё безнадзейнасці, — расказвала нам Алена ў выбарчую нядзелю.

Візіт на Падляшшы назіральнікі пачалі аднак дзень да выбараў, з сустрэчы з Маркам Рыбнікам, дырэктарам беластоцкай дэлегатуры Краёвага выбарчага бюро разам з чацвёркай суддзяў уваходзячых у склад Акруговай выбарчай камісіі ў Беластоку, між іншым з яе старшынёй Багданам Лашкевічам.

— Усе нашы абавязкі вынікаюць з закону аб выбары прэзідэнта, — пачаў сваю сустрэчу Марк Рыбнік.

Аднак маладым назіральнікам не трэба было спецыяльна тлумачыць складанасцей польскага выбарчага права і ўжо зусім міжнародных правіл у гэтай тэме. Маладая беларуска Настасся Матчанка (ёй за дваццаць гадоў), каардынатарка выбарчага праекта, выпускніца юрыдычнага факультэта ЕГУ, пражываючая ў Вільні, патлумачыла, што шмат хто з маладых назіральнікаў, якія прыехалі на Падляшша, раней прыглядаліся ўжо разнавідным выбарам у Нарвегіі, Грузіі, Украіне, Літве і Беларусі:

— У нашай метадалогіі назірання прынялі мы г.зв. прынцып рамонкавай кветкі. Згодна з ёю ў цэнтры нашага зацікаўлення знаходзіцца Беласток, а ездзім групамі па абшарах вырысаваных на карце ў кшталт пялёсткаў якраз рамонка.

Назіранне за польскімі выбарамі з'яўляецца часткай праграмы „Назіранне выбараў: практыка і тэорыя". Падобна як у іншых краінах, маладыя людзі распытвалі на выбарчых участках у старшынь камісій аб дэталі звязаныя з выбарчым працэсам, уважліва прыглядаліся урнам і спосабу аддавання галасоў і ўвогуле арганізацыі працы на ўчастках. Запаўнялі спецыяльныя апытальнікі на англійскай мове, у якіх меццілі крыжыкі пры больш за дзесяці пытаннях датычных м.інш. ліку ўпаўнаважаных да галасавання і выдадзеных пасведчаннях галасуючым пастаянна пражываючым у іншых мясцовасцях, вядзення агітацыі на ўчастках, спосабе працы ў выбарчых камісіях і ліку асоб засядаючых у іх, прысутнасці мужоў даверу, даступнасці выбарчых участкаў для інвалідаў, адлегласці да выбарчых акруг з месца пражывання выбарчыкаў.

— Калі б у вас была ахвота да размоў з выбаршчыкамі, дык калі ласка толькі па-за выбарчымі ўчасткамі, — інфармаваў маладых людзей яшчэ ў суботу дырэктар Рыбнік і адзначаў: — У Польшчы краёвыя выбарчыя правілы вышэй міжнародных.

Назіральнікі цікавіліся, што адбываецца з выбарчымі картамі для галасавання пасля выбараў. Марк Рыбнік тлумачыў, што яны ахоўваюцца разам з адным з двух пратаколаў у сейфах устаноў войтаў, бурмістраў і прэзідэнтаў гарадоў да часу разгляду ўсіх магчымых выбарчых скаргаў судамі, а пасля тыя карты знішчаюцца, а пратаколы трапляюць у дзяржаўныя архівы.

— Ці можна рабіць здымкі ў выбарчых участках у час галасавання? — пыталіся назіральнікі.

Міраслаў Тшаска, суддзя ў АВК:

— Прыватныя асобы маюць права на ахову свайго ліку. Публічныя асобы, якімі ў дзень галасавання з'яўляюцца члены выбарчых камісій, не маюць такога права, значыць, ім здымкі можна рабіць.

Марк Рыбнік дадаў тут жартам, што выклікала шмат радасці:

— Гэта пры ўмове, што члены камісіі мілавідныя.

Старшыня Лашкевіч адзначыў:

— Першы раз у гэтых выбарах можна галасаваць праз упаўнаважанага, які можа прагаласаваць ад імя асобы хворай або якой споўнілася 75 гадоў жыцця. Гэта вялікі эксперымент і невядома, ці апраўдаецца. Можа, на жаль, даходзіць да злоўжывання, напрыклад тады, калі хтосьці схоча „штосьці" здабыць за атрыманне ці выдачу паўнамоцтва.

У сваю чаргу на іншыя пытанні суддзя Тшаска адказваў:

— Прэзідэнцкія выбары ў Польшчы выклікаюць меншыя эмоцыі і тут не бывае асаблівых злоўжыванняў. Вялікія эмоцыі спадарожнічаюць самаўрадавым выбарам, калі выбіраем суседа.

— Ці можна ў Польшчы галасаваць праз інтэрнэт? — хтось паставіў такое пытанне.

Марк Рыбнік:

— Для гэтага неабходна ўвесці электронны подпіс.

У дзень выбараў маладыя назіральнікі паявіліся ў акруговых камісіях з ідэнтыфікатарамі, якія выдала ім Дзяржаўная выбарчая камісія. На бэджыках было напісана, што маюцца яны быць трактаваныя як мужы даверу з магчымасцю прабывання на выбарчых участках таксама пасля іх закрыцця, значыць, у час падліку галасоў. „Наша" група пачала назіранні ў 8.10 з аднаго з трох выбарчых участкаў у Пачатковай школе № 19 па вуліцы Мешка Першага ў Беластоку. Тут на сустрэчу тройкі маладых беларусаў выйшаў старшыня камісіі Ян Валосік:

— Да гэтага часу прагаласавалі 43 асобы з 1887 уключаных у спіс выбаршчыкаў, — сказаў.

У пэўны момант падышоў да яго пажылы мужчына:

— А чаму не адчынена ўязная брама для інвалідаў?!

— Ой, ужо адчыняў... — збянтэжыўся старшыня Валосік.

У той час іншы з членаў камісіі хадзіў перад будынкам, правяраючы, ці не паявіліся выпадкам на ім ці вакол яго лістоўкі або выбарчыя плакаты.

Праз амаль паўгадзіны рушылі мы ў глыбінку. Спачатку трапілі ў Публічную гімназію ў Дубінах па вуліцы Галоўнай. Шырмы аддзяляючыя галасуючых, апячатаная ўрна, на фоне сцягі Польшчы і Еўрасаюза, пара старэйшых людзей без праблем укідвае карты ў урну... На просты пагляд — усё ў парадку. Недзе праз 40 хвілін мы ўжо перад шпіталем у Гайнаўцы (вул. Ліпавая). І тут замяшанне. З нейкай сям'ёй, якая прыйшла прагаласаваць, маем праблему з адшуканнем выбарчага ўчастка, а іх тут два: адкрыты (для навакольных жыхароў) і асобны (для пацыентаў). Быццам бы ёсць указальнікі дзе яны знаходзяцца, але трапіць туды цяжка. Урэшце па лесвіцы карабкаемся да першага з іх; выбаршчыкі-інваліды не маюць на гэта шанцаў. Шэфіха нашай групы штосьці запісвае ў апытальніку.

Старшыня гэтай камісіі інфармуе:

— Да гэтага часу было двое людзей з пасведчаннямі на права на галасаванне са свайго месца жыхарства. Агулам у нас у спісе выбаршчыкаў ёсць 1 181 асоба.

Зараз пасля ў выдзеленым шпітальным участку старшыня тутэйшай камісіі Ева Пех, пасля ўважлівай праверкі ідэнтыфікатараў назіральнікаў, інфармуе:

— У нас 142 асобы маюць права на галасаванне. Калі хтосьці трапіў у бальніцу пазней чым у чацвер, можа яго не быць на спіску. Калі захоча, пазвонім у гарадскую ўправу, а там праверацъ, ці маюць тыя асобы права на галасаванне і заносім іх у спісак. Некаторыя ж з іх могуць быць, напрыклад, недзеяздольнымі, без выбарчых правоў.

Калі мы прабываем на гэтым участку, паяўляецца мужчына гадоў пад пяцьдзесят з адной з вёсак Чаромхаўскай гміны. Званок у Гмінную ўправу. Пасля хвіліны пацыент трапляе ў дадатковы спісак, пакуль неапячатаны. Аб'язджаем у Гайнаўцы комплексы школ № 1 і № 3. Паяўляемся таксама ў Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы. На першы пагляд усё о'кей. Аднак у гэтай апошняй школе тройка назіральнікаў пад уражаннем надпісаў і іншага роду беларускіх акцэнтаў; не хочацца ім адсюль хутка выходзіць.

— Калі ў нас будуць такія школы? — ціха пытаецца Настасся.

Алена дадае:

— Можа, праз дзесяць-дваццаць гадоў.

Каля поўдня даязджаем у Гайнаўскі дом культуры імя Тамары Салаеневіч. Крыху тут цемнавата, таму ў кабінах (у памяшканнях аддзеленых шырмамі) пастаўлены і ўключаны дадатковыя лямпачкі.

— Гэта найбольшая акруга ў Гайнаўцы. Разам тут 2 254 асобы ўпаўнаважаныя да галасавання, — расказвае старшыня камісіі Раман Ажахоўскі. — Прыйшоў да нас адзін выбаршчык без дакумента са здымкам, таму не мог аддаць голасу. Іншы быў прыпісаны да іншай камісіі і туды мы яго адправілі. Дагэтуль не з'явіліся мужы даверу [гэтак было і ў іншых участках, якія мы наведалі — М. Х.]. Але тут, у камісіі, мы з усіх палітычных плыняў і пільнуем адзін аднаго ўзаемна.

Зараз пасля 13 гадзіны мы ў святліцы ў Новым Беразове (573 упаўнаважаных да галасавання). Пачынае накрапваць дождж. Старшыня камісіі Альжбета Бугвіч:

— Дагэтуль прыйшло няшмат асоб. Можа, калі перастане ісці дождж, і пасля абеду паявіцца іх больш. Найдалей распаложана хёска Хітрая, недзе 3-4 кіламетры адсюль. Ды людзі даедуць сюды хоць бы і на веласіпедах.

Калі мы ў новаберазоўскай святліцы, паяўляецца пажылы Мікалай Каліноўскі, якраз з Хітрай. У размове з „Нівай" не скрывае: „Я свой голас аддаў на Напяральскага".

— Але ж і мітрапаліт Сава, і хоць бы Владзімеж Цімашэвіч заклікалі падтрымаць Бранісалва Камароўскага? — мы крыху здзіўлены.

Спадар Мікалай:

— Можа ў іх суполка якая, ці што. А я і так ведаю сваё.

Назіральнкі пад уражаннем: уся камісія размаўляе па-беларуску.

Сорак хвілін пасля: святліца ў Старым Корніне. На 460 асоб, якія маюць выбарчыя правы, прагаласавала ўжо 150 выбаршчыкаў. Неўзабаве Комплекс школ па вуліцы Паркавай у Дубічах-Царкоўных. Старшыня Вольга Рэпка, як адзіная з членаў камісій, з якімі размаўляем на нашым шляху, просіць, каб інфармавацца перад участкам:

— У нас дагэтуль было дваццаць асоб з пасведчаннямі.

Таксама перад участкам у Дубічах сустракаем двух мужчын: шасцідзесяцігадовага Яна і трыццацігадовага Пятра. Свой голас аддалі яны на Напяральскага (абодва гавораць па-беларуску). Спадар Пятро:

— Кожны думае па-свойму. Не звяртаю ўвагі на тое, што кажуць пры выбарах Цімашэвіч ці мітрапаліт. Тое, што гаварылі пра Камароўскага, дык гэта нейкі маркетынгавы прыём, як кажуць у тэлевізары. Гэта католікі галасуюць так, як ім скажа Касцёл.

Буды. Па нашай „распісцы" ўчастак мае быць таксама ў святліцы. Здзіўленне. Участак — у каталіцкай капліцы святога Войцеха. На адной са сцен і ў адной з дзвюх кабін — партрэты Яна Паўла II. Член камісіі — як сама сябе называе: *z ramienia* войта — Барбара Шума:

— З пасведчаннямі ўжо прагаласавалі ў нас спадарства Вінярскія [вядуць Паўшэхны ўніверсітэт імя Яна Юзафа Ліпскага ў блізкіх Тэрэмісках — М. Х.] і пан Адам Вайрак [гэты вядомы публіцыст-прыродазнавец таксама пражывае ў Тэрэмісках — М. Х.]. Тут была калісьці святліца. Калі ў ваколіцы жылі маладыя, былі дыскатэкі. Маладыя павыязджалі. Засталіся старэйшыя. Раз у тыдзень прыязджае ў гэтую былую свяліцу ксёндз з Нараўкі і правіць набажэнства.

Праз паўгадзіны — участак у Войнаўцы (таксама святліца).

— Тут галасуюць людзі пажылога ўзросту. Прысутнасць больш-менш такая самая, як і на іншых выбарах. Упаўнаважаных не было, ані асоб на калясках, хоць на нас абавязак памагчы ў тым, каб дабраліся да ўчастка, — распавядае старшыня Эмілія Сямонюк.

Пасля 16 дабіраемся ў Белавежу. Спачатку Белавежскі цэнтр культуры. Віцэ-старшыня камісіі Дарыюш Каладзінскі:

— У нас 1 643 асоб з правам аддаць голас. Не было ўпаўнаважаных...

На канец выбарчых падарожжаў па глыбінцы з'яўляемся ў белавежскі Дом сацыяльнай апекі „Ракітнік". На пяць дзесяткаў упаўнаважаных да галасавання, прагаласавала дзевятнаццаць (прабывае тут 64 рэзідэнтаў). Члены камісіі кажуць, што больш выбаршчыкаў, мабыць, не будзе. Вяртаемся ў Беласток.

Праект у Польшчы рэалізаваны дзейнічаючым у Вільні Цэнтрам супольных ініцыятыў для Беларусі, Беларускім домам правоў чалавека, Еўрапейскім гуманітарным універсітэтам ды шведскім Міжнародным культурным цэнтрам пры дапамозе Цэнтра грамадзянскай адукацыі Польшча-Беларусь у Беластоку і Радыё Рацыя.

P.S. Ва ўсіх гмінах паўднёва-ўсходняй Беласточчыны ў першым туры безагаворачна перамог Браніслаў Камароўскі. Другое месца заняў Гжэгаж Напяральскі.

*(працяг з папярэдняга нумара)*

# Поспехі і паразы ў самаўрадавай дзейнасці

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

**Калі глянуць на самаўрадавую дзейнасць у Гайнаўцы і ў гмінах, дзе жывуць беларусы (не аналізую самаўрадавай дзейнасці і культурных ініцыятыў у Беластоку і іншых гарадах Польшчы, дзе жывуць беларусы), дык вялікая частка плюсаў і мінусаў гэтай дзейнасці будзе падобная да тых з Бельска-Падляшскага. Найбольш заўважальныя адметнасці могуць тычыцца спосабаў кіравання самаўрадамі і выбару інвестыцый, якія рэалізаваліся ў першую чаргу. Хаця, напрыклад, у Гайнаўцы няма патрэбы праводзіць археалагічных раскопкаў, то ўжо трэба старацца захаваць драўлянае будаўніцтва міжваеннага перыяду з яго адметнай архітэктурай. У папярэднім скліканні ў Радзе горада Гайнаўкі вялася ажыўленая дыскусія наконт патрэбы рэстаўрацыі старога драўлянага будынка па вуліцы 3 Мая, у якім раней знаходзіўся аўтавакзал. Аднак вырашана аб яго зносе, паколькі спецыялісты ацанілі, што будынак практычна не падыходзіць да рэстаўрацыі па прычыне моцнага знішчэння сцен. Участак пад гэтым будынкам і вакол яго быў перададзены на ўласнасць каталіцкаму прыходу, паколькі знаходзіцца ён па-суседску з касцёлам Уздзвіжання Крыжа і зараз на ім стаіць помнік папу Яну Паўлу II.**

Беларуская пастаноўка ў выкананні дзетак Самаўрадавага садка № 3 у Гайнаўцы, якіх падрыхтавала настаўніца Вера Масайла

## *Стараюцца захаваць парытэт*

— У Гайнаўцы помнік папу збудаваны быў за сродкі спонсараў, а ў нас, у Бельску, 400 тыс. зл. выдзелена з гарадскога бюджэту на будову вялікага помніка Яну Паўлу II і разам з падрыхтоўкай плошчы пад гэты праект горад выдаткуе на яго пад 500 тысяч злотых, — сказаў бельскі радны Дарафей Фіёнік.

Праваслаўныя бяльшчане таксама разважаюць мэтазгоднасць будовы такога дарагога помніка. Калі б у Бельску жылі адны католікі, пэўна не было б такой дыскусіі. У Радзе горада Гайнаўкі таксама заўважаецца падзел па лініі праваслаўныя і католікі. Калі справа тычыцца выдаткавання сродкаў з гарадскога бюджэту, бурмістр і радныя наогул сочаць за парытэтнасцю дапамогі для праваслаўных і католікаў. Прыблізна напалавіну была раздзелена ў Гайнаўцы маёмасць па былой гарадской бальніцы, дзе зараз праваслаўныя вядуць Дом міласэрнасці і іншую дабрачынную дзейнасць, а католікі будуюць вялікі касцёл. Папалам была раздзелена тэрыторыя побач лесу, пры дарозе ў Кляшчэлі, дзе яшчэ ў межах Гайнаўкі маюць быць здадзены ў будучыні ў карыстанне праваслаўны і каталіцкі могільнікі. Начное падсвятленне Свята-Троіцкага сабора і Уздзвіжанскага касцёла таксама робіцца парытэтна, хаця на адной з сесій рады папракнуў бурмістра, што царква лепш падсветлена, чым касцёл. Калі восенню мінулага года каталіцкія радныя выступілі з прапановай выдатказаць большыя сродкі з гарадскога бюджэту на дзейнасць каталіцкай моладзі і парытэтна столькі ж сама на дзейнасць кіно ў Беларускім музеі, бурмістр адмоўна ацаніў гэтую прапанову. Звярнуў ён увагу, што ўспамагаючы дзейнасць каталіцкай арганізацыі, трэба было б такую ж дапамогу аказаць і праваслаўнай моладзевай арганізацыі ў Гайнаўцы.

## *Мала сродкаў на беларускую культуру*

На жаль, няма ў нашых гарадах парытэтнага раздзелу сродкаў па нацыянальнасцях, паміж палякаў і беларусаў, у галіне культуры (не бяру тут пад увагу нашых вёсак). На працягу 20 гадоў працы самаўрадаў часта ў нашых гмінах было надта мала сродкаў выдзеленых на дзейнасць у галіне беларускай культуры. З часам фінансаванне культуры стала папраўляцца, але найчасцей беларускія фэсты і іншыя пленэрныя мерапрыемствы, дзе спявалася па-беларуску, ладзілі беларускія арганізацыі, а гмінныя ўлады ўспамаглі іх месцам, апаратурай і невялікімі фінансамі. Найбольш беларускіх мерапрыемстваў з ліку вясковых самаўрадаў самастойна ладзілі Гарадоцкая, Чыжоўская, Арлянская, Нарваўская і Нараўчанская гміны. Многа беларускіх імпрэзаў самастойна ладзілі прадстаўнікі самаўрадаў з Гайнаўкі і Бельска, але патэнцыял гэтых гарадоў намнога большы, чым вясковых гмін, і можна было б у іх задумацца над іншымі праявамі беларускай культурнай актыўнасці.

Наогул у нашых гмінах, за выключэннем Гайнаўкі і Бельска, было мала беларускіх мерапрыемстваў і іншых форм беларускай культурнай актыўнасці адрасаваных да дзетак і моладзі, якія разбуджалі б і замацоўвалі б беларускую нацыянальную свядомасць. Аднак апошнім часам у гэтай дзялянцы станоўча вылучыўся Гмінны асяродак культуры ў Нарве, дзе часта ў Крыўцы і іншых вёсках ладзіліся мерапрыемствы з цыкла „Жыве яшчэ традыцыя", у час якіх па-беларуску выступалі вучні. Установы, што фінансуюцца самаўрадамі, ладзілі імпрэзы маладым людзям з улікам на свае традыцыі і беларускае слова таксама ў Гарадоцкай, Арлянскай, Дубіцкай, Нараўчанскай і іншых гмінах, але іх было надта мала ў параўнанні да патрэб.

У нашых школьных і гмінных бібліятэках вельмі мала сучасных беларускіх выданняў (па-за бельскай „тройкай" і белліцэямі). У многіх нашых бібліятэках гаворыцца, што не купляюцца беларускія кніжкі, бо няма на іх сродкаў або мала хто іх чытае. Аднак цяжка спраўдзіць ці моладзь і дарослыя чыталі б сучасную беларускую літаратуру, калі найчасцей у бібліятэках яе днём з агнём не знайсці. Мала дзе гмінныя ўстановы падпісваюцца на „Ніву" або „Часопіс", хаця пастаянна вядзецца падпіска на польскія штодзёнкі. Па-рознаму выглядае таксама падпіска на „Ніву" ў гмінныя асяродкі культуры і бібліятэкі, дзе чытачы маглі б пачытаць беларускую прэсу. Зразумела, цяжка сказаць, што ў нашых гмінах нечага ёсць за мала, калі не прыраўняць гэтага да іншых самаўрадаў. У нашым штотыднёвіку пералічваліся шматлікія праявы мастацкай і іншай культурнай дзейнасці літоўцаў у Пунскай гміне, з якіх мы маглі б браць прыклад, а пункі войт запрашаў нашых самаўрадаўцаў прыехаць і паглядзець вынікі іх дзейнасці, між іншым, двухмоўныя ўказальнікі.

Апошнімі гадамі станоўча вылучыўся Гмінны асяродак культуры ў Нарве — арганізатар мерапрыемстваў з цыкла „Жыве яшчэ традыцыя", у час якіх вучні выступаюць па-беларуску

## *Толькі некаторыя пакарысталіся магчымасцямі*

Вялікія магчымасці паявіліся перад нашымі гмінамі, калі ў сілу ўступіў закон аб нацыянальных і этнічных меншасцях. Першыя новымі магчымасцямі пакарысталіся радныя Гайнаўкі, якія прынялі прапанову Беларуска-народнага выбарчага камітэта і прагаласавалі за ўвядзенне беларускай мовы ў якасці дапаможнай у зносінах паміж мясцовым насельніцтвам і гміннымі чыноўнікамі. Гэта дало магчымасць не толькі размаўляць па-беларуску ў магістраце, але і пісаць прашэнні па-беларуску, а чыноўнікі таксама абавязаны ў такіх выпадках весці карэспандэнцыю з беларусамі на іх роднай мове, хаця афіцыйныя дакументы будуць выдавацца на польскай мове. Услед за гайнаўскімі раднымі пайшлі радныя з Арлянскай, Нараўчанскай і Чыжоўскай гмін і прынялі такія ж самыя пастановы аб дапаможнай беларускай мове. Радныя Арлянскай гміны пайшлі намнога далей і з актыўнай падтрымкай войта Пётра Сэльвесюка прынялі пастанову аб двухмоўных указальніках. Зараз чакаюць яны ацэнкі сваіх прапаноў камісіяй, што дзейнічае пры Міністэрстве ўнутраных спраў і адміністрацыі, наконт моўнай папраўнасці назваў мясцовасцей на беларускай мове і іх згоднасці з гістарычнымі запісамі. Радныя спадзяюцца, што яшчэ ў гэтым годзе з'явяцца ўказальнікі з назвамі Орлі і астатніх вёсак па-польску і па-беларуску. Гэта ўсё цешыць, а найбольш тое, што адбылося ў Арлянскай гміне. Аднак шкада, што за раднымі з Орлі і суседніх мясцовасцей не пайшлі самаўрадаўцы з іншых гмін.

— У нашай радзе не было дыскусіі наконт увядзення беларускай дапаможнай мовы для зносін з чыноўнікамі і ніхто з такой прапановай не выступаў, — заявіў бельскі радны Дарафей Фіёнік.

Беларускія радныя з Бельска тлумачаць, што не былі б яны ў змозе пераканаць радных іншых нацыянальнасцей да прапановы аб дапаможнай мове. Затое з вялікім праўдападабенствам маглі б быць прыняты такія пастановы ў многіх нашых вясковых гмінах, калі б ініцыятыва выйшла ад войтаў. Найчасцей у справах, якія непасрэдна не тычацца інвестыцый, радныя ў нашых гмінах галасуюць за прапановы войтаў або часта галасуюць супраць ідэям, калі тыя выходзяць ад групы радных, а іх не падтрымліваюць войты. Шкада, што так мала нашых войтаў рашылася падтрымаць ідэю двухмоўя ў гмінных установах, якая практычна нічога не каштуе і толькі адзін арлянскі самаўрад рашыўся на двухмоўе на ўказальніках.

*(заканчэнне ў чарговым нумары)*

# Літаратурныя падарожжы

*(польскамоўныя пісьменнікі на Берасцейшчыне)*

## X

**Завяршыць наша літаратурнае падарожжа (альбо пачаць) варта сядзібай Нямцэвічаў, якая месціцца ў вёсцы Скокі. Калі ехаць з Высокага ў Берасце, нельга не заўважыць перад вёскай Цюхінічы справа шыльду з адпаведным надпісам „Сядзіба Нямцэвічаў”**

Гэтае месца звязана з імем пісьменніка і гісторыка Юльяна Урсына Нямцэвіча. Тут ён нарадзіўся 16 лютага 1757 года. Пасля заканчэння Берасцейскага езуіцкага калегіума ў 1770 годзе паступіў у Рыцарскую школу (Варшаўскі кадэцкі корпус). Скончыўшы яго ў 1777 годзе, служыў ад'ютантам у свайго апекуна князя Адама Казіміра Чартарыйскага ў яго рэзідэнцыі ў Пулавах. Тут ён захапіўся краязнаўчай і мемуарнай літаратурай, што падштурхнула яго да вандровак па Еўропе. Наведванне Англіі, Францыі, Нямеччыны, Аўстрыі, Галандыі, Італіі і Сіцыліі прывіло яму добры эстэтычны густ, веданне еўрапейскага жыцця, а таксама пашырыла яго кругагляд.

Юльян Нямцэвіч прыняў актыўны ўдзел у Сейме 1788-1792 гг., які па прапанове літоўскага віцэ-канцлера Іаахіма Літавора Храптовіча заснаваў першую ў Еўропе Адукацыйную камісію. Адным з членаў камісіі быў Нямцэвіч.

Працуючы інфляндскім паслом, наш зямляк прымаў актыўны ўдзел у стварэнні і абароне Канстытуцыі 3 мая 1791 года, якая абвясціла суверэннасць Рэчы Паспалітай як унітарнай дзяржавы. „Але Таргавіцкая канфедэрацыя 1792 года, якая супрацьстаяла прагрэсіўным рэформам сейма і Канстытуцыі, прымусіла Юльяна Нямцэвіча разам з аднадумцамі на нейкі час пакінуць радзіму”.

Менавіта ў гэты перыяд ён, абураны, піша „Элегію да вясны” і ставіць камедыю „Вяртанне пасла”, а таксама выдае „Нацыянальную газету”. У ёй ён бязлітасна крытыкуе карыслівасць і абмежаванасць шляхты.

Падчас вызваленчага паўстання 1794 года Нямцэвіч працуе ад'ютантам і сакратаром у Тадэвуша Касцюшкі. Падчас вайсковай нарады ў Гародні ўручаў паўстанцам пярсцёнкі з надпісам „Айчына свайму абаронцу”. 10 лістапада 1794 года ў бітве пад Мацяёвіцамі (на Мазоўшы) быў паранены. Разам з Касцюшкам, трапіўшы ў палон, адбываў пакаранне (2 гады) ў Петрапаўлаўскай крэпасці ў Пецярбургу.

19 снежня 1796 года сябры выехалі ў ЗША. У Філадэльфіі блізка сышліся з першым прэзідэнтам Злучаных Штатаў Джорджам Вашынгтонам — героем вайны за незалежнасць Паўночнай Амерыкі.

У 1800 годзе Нямцэвіч узяў шлюб з удавой Касцюшкі Сьюзэн Лівінгстон Кін (пазнаёміліся ў Фінляндыі па дарозе ў Амерыку). Жылі спачатку ў штаце Вірджынія, а потым пераехалі ў Нью-Джэрсі.

Атрымаўшы паведамленне аб смерці бацькі, Юльян вяртаецца ў Скокі. За паўтара года на радзіме выдаў 7 кніг самых розных жанраў: камедыі, трагедыі, байкі, оды, песні, літаратурна-гістарычныя творы, лісты („хацеў, як калісьці Цыцэрон рымскую мову, сцвердзіць (dowieść) і нашу мову”) („Album biograficzny zasłużonych Polaków i Polek wieku XIX”, t. 1, s. 60).

Разам з захапленнем творчасцю Нямцэвіч актыўна змагаецца за адраджэнне краю: „Хто ведае пачуцці ў момант сустрэчы з доўга не бачанай радзімай, зразумее і мяне”.

У Варшаве пісьменнік заняў сваю ранейшую пасаду члена Адукацыйнай камісіі, а з 1827 года стаў старшынёй Таварыства сяброў навук.

У часе паўстання 1830-1831 гг. уваходзіў у склад Часовага ўрада паўстанцаў і быў абраны сенатарам-кашталянам. А ў 1833 годзе эміграваў у Парыж. Вельмі сумаваў па Радзіме і марыў вярнуцца сюды, каб даследаваць мілы сэрцу куток: „Край мой у першай маладосці маёй неасэнсавана спазнаны, у сівым жа веку жадаў бы яшчэ паўней разглядзець і спазнаць яго”.

Памёр Юльян Урсын Нямцэвіч 31 траўня 1841 года.

Спадчыну пісьменніка складаюць 12 тамоў „Збору твораў”, сярод якіх — уражанні ад вандровак па Амерыцы і польскіх землях, гістарычныя песні і жыцці знакамітых людзей, а таксама мемуары пра старажытную Польшчу.

Даследчыкі творчасці Нямцэвіча адзначаюць у ім так званы „краёвы” патрыятызм, пры гэтым узгадваючы яго прапанову Адаму Міцкевічу змяніць у першым радку паэмы „Пан Тадэвуш” слова „Літва” на „Польшча”.

„Патрыятычны погляд на Радзіму ўвасобіўся не толькі ў факталагічным вывучэнні пісьменнікам яе гістарычнага мінулага, але і ў асаблівым замілаванні малюнкамі родных краявідаў”: „Хай ведаюць пышны Парыж і багаты Лондан: я сыходжу ў літоўскія бары, можа не такія прыемныя і забаўныя, але яны хапаюць мяне за жывое, бо неад'емныя ад бясконца прыгожай і бясконца няшчаснай айчыны маёй”.

Шчаслівага падарожжа ўсім, каго зацікавяць мае допісы

**Тамара ЛАЎРАНЧУК,**
**г. Высокае**

Піць ці не піць? Адказ на гэтае амаль шэкспіраўскае пытанне кожны дае сабе сам. Для кагосьці яно раўназначна пытанню „далучыцца да кампаніі старых добрых сябрукоў, якіх не бачыў колькі гадоў, з бутэлькай добрага віна ці не?”, а для кагосьці яно ўжо азначае „жыць ці не жыць?”. Што ж тычыцца аўтараў і натхняльнікаў сайта „Цьвярозая Беларусь”, то там двух адказаў быць не можа — толькі „не”, прычым неаднаразовае.

Месціцца гэты ўнікальны антыалкагольны сайт па адрасе **http://nonalcohol.org.** Унікальны таму, што знайсці нешта падобнае на роднай мове ў Байнэце пакуль не ўдалося. А гэты партал існуе ўжо з 2007 года.

Выглядае сайт вельмі прывабліва, нягледзячы на тое, што аздабленняў у ім практычна няма аніякіх. Белы і чырвоны колеры прызначаны прыцягнуць увагу да праблемы п'янства і алкагалізму не толькі ў Беларусі, але і на цэлым свеце. Бо гэтая праблема, як сведчаць прыведзеныя там даныя Сусветнай арганізацыі аховы здароўя (той самай, што летась напужала планету „свіным грыпам”), з'яўляецца прычынай смерці кожнага трэцяга земляніна. Правільна падлічылі ў СААЗ ці не — адказаць цяжка, але такая праблема сапраўды існуе ў кожнай краіне. Таму на пастаўленае на галоўнай старонцы пытанне: „Як жа так адбылося, што пры цалкам відавочнай шкодзе алкаголю і тытуню, мы так угразьлі ва ўсім гэтым?”, аўтары сайта пішуць, што віной усяму з'яўляецца бездухоўнасць і прапануюць сваё выйсце са змрочнай рэчаіснасці. Па іх словах, для гэтага патрэбныя „Моц, Веданьне і Дабрадзейнасьць. Моц дае цеплыню і сьвятло, якія ўплываюць на наш рост і наша разьвіцьцё. Веданьне — гэта тое, з дапамогай чаго трэба разумець і рэгуляваць сваё жыцьцё. Дабрадзейнасьць — мэта, да якой варта імкнуцца”.

На астатніх старонках сайта невядомыя ягоныя аўтары старанна распавядаюць пра ўсе адмоўныя бакі ўжывання алкаголю. Прычым робяць яны гэта, разбураючы, па іх меркаванні, міфы, што так ці інакш апраўдваюць такое ўжыванне. Асабліва добра гэта відаць на старонцы „Алькагольныя міты”, кожны з якіх пазначаны словам „Мана”. Адсюль мы можам даведацца, што „для алькаголю, як наркотыку, не існуе бясшкодных доз, як і для морфію, гераіну і іншых наркотыкаў, прызначаных толькі лекарамі ў вельмі малых дозах і на кароткі тэрмін, то бок, на 1-2 дня”; „П'янай весялосьці няма і быць не можа ў навуковым і разумным сэнсе гэтага стану” ці „Менавіта на вясельлі спажываньне алькаголю асабліва шкодна і нават злачынна”. Праўда, аб біблейскім расповедзе пра тое, як Хрыстос, будучы на вяселлі, пераўтварыў ваду ў віно, бо гасцям не хапала, чамусьці не ўзгадваецца.

Цяжка ўявіць падобны сайт без прывядзення статыстычных даных — іх мы можам знайсці на старонцы „Статыстыка”. Адсюль мы даведаемся, што „кожная чацьвёртая сьмерць сярод маладых мужчын у Эўропе выкліканая алькаголем”. Гэта сведчанні ўсё той жа СААЗ.

На сайце таксама месцяцца фотаздымкі, на якіх „спыніліся п'яныя імгненні”. На дзіва, іх зусім нямнога і яшчэ менш тых, што могуць пакінуць нейкае яскравае ўражанне. Тут аўтарам сайта яшчэ ёсць над чым працаваць.

**Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ**

### Крызіс фаварытаў

Першы этап чэмпіянату свету ў самым разгары. Агульная характарыстыка мундыялю — крызіс многіх з грандаў, якія рэальна рызыкуюць не выйсці ў 1/8 фіналу. У гэтым аглядзе вельмі коратка пра падзеі другога тура.

У групе „А” Мексіка ўпершыню ў гісторыі адолела Францыю — 2:0. Форвард Хаўер Эрнандэс забіў юбілейны 2100-ы гол чэмпіянатаў планеты. А ветэран Куаўтэмок Бланка па-майстэрску выканаў пенальці і стаў трэцім па старшынстве, каму ўдавалася забіваць на першынствах свету.

**„А”: Уругвай і Мексіка — па 4 пункты, Францыя і ПАР — па 1.** У заключным туры паміж сабой згуляюць лідары квартэту і аўтсайдары.

У групе „В” аргенцінская дружына з буйным лікам 4:1 адолела паўднёвых карэйцаў. Сіла сённяшняй аргенцінскай дружыны ў індывідуальным майстэрстве асобных выканаўцаў. У „альбіселестэ” тры галы запісаў на свой рахунак Гансала Ігуаін — першы хет-трык мундыялю. Іх не было, зрэшты, ажно з 2002 года. Грэцыя ў спатканні з нігерыйцамі здабыла гістарычныя першы гол і першую перамогу ў фінальных стадыях чэмпіянатаў свету — 2:1 на карысць балканцаў.

**„В”: Аргенціна — 6, Рэспубліка Карэя і Грэцыя — па 3, Нігерыя — 0.** У апошнім туры сустрэнуцца Нігерыя — Карэя і Грэцыя — Аргенціна.

Сустрэчу ў групе „С” Славенія — ЗША можна назваць пакуль найбольш яркай падзеяй бягучага мундыялю. Матч годных сапернікаў, які скончыўся баявой нічыёй — 2:2. Амерыканская дружына стала першым калектывам на чэмпіянаце, якому ўдалося адыграцца пры ліку 0:2. А вось зборная Англіі, якая лічылася галоўным фаварытам квартэта, расчаравала прыхільнікаў. Бяззубая просталінейная гульня не магла прынесці брытанцам жаданыя 3 ачкі ў паядынку з Алжырам — 0:0.

**„С”: Славенія — 4 ачкі, ЗША і Англія — па 2, Алжыр — 1.** У апошнім туры пазмагаюцца Славенія — Англія і ЗША — Алжыр.

У групе „D” Нямеччына саступіла сербам — 0:1. Германія не прайгравала сербам 37 гадоў, ажно з 1973 года. Галкіперу сербаў Уладзіміру Стойкавічу першаму на чэмпіянаце ўдалося парыраваць 11-метровы. У матчы прадстаўнікоў Зялёнага кантынента і Ганы аўстралійцы дзеілі настойліва і актыўна, першымі забілі, але ўсю „маліну” ім папсаваў італьянскі рэферы Рабэрта Разецці, які нібыта за гульню рукой прызначыў пенальці і да таго ж выдаліў з поля ветэрана Хары К'юэла. 11-метровы — ужо свой другі на гэтым турніры — рэалізаваў Азамоа Г'ян. У выніку — 1:1.

**„D”: Гана — 4 ачкі, Нямеччына і Сербія — па 3, Аўстралія — 1.** У апошнім туры немцам, каб гарантавана выйсці ў 1/8 фіналу, патрэбна адолець афрыканцаў. Такое ж заданне стаіць перад аўстралійцамі ў паядынку з сербамі.

У групе „Е” прасвятленне сітуацыі надышло найхутчэй. Нідэрландцы, якія нетрадыцыйна выяўляюць сябе рацыяналістамі, адолеўшы 1:0 Японію, выйшлі ў 1/8 фіналу. Аранжавыя не прайграваюць з 2008 года, выйграўшы 10-ы афіцыйны матч запар (!). Сустрэча Даніі і Камеруна (2:1) можа прэтэндаваць на прэмію ў намінацыі „найбольш адкрытая гульня”.

**„Е”: Нідэрланды — 6 ачкоў, Японія і Данія — па 3, Камерун — 0.** Камерун не мае больш шанцаў. Японцы і датчане выявяць другога шчасліўчыка, прытым азіятаў задавальняе нават нічыя.

Група „F” не парадавала глыбокім зместам. Славаччына нічога не змагла супрацьставіць Парагваю — 0:2. Матч Італія — Новая Зеландыя завяршыўся сенсацыйнай нічыёй — 1:1.

**„F”: Парагвай — 4 ачкі, Новая Зеландыя і Італія — па 2, Славаччына — 1.** У заключным туры парагвайцы згуляюць з новазеландцамі, а еўрапейцы паміж сабой.

**Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ**

# Забытая традыцыя пераходаў

Альжбета РАМАНЧУК

Фота Канстанціна МАРТЫНЮКА

У некалькіх мясцовасцях існуе яшчэ традыцыя пераходаў. Калісьці ўсе вяскоўцы і свяшчэннікі абыходзілі палі ў ваколіцы. Жыхары супольна малілі-ся за дабрабыт, удалы плён і здароўе гаспадароў. У сённяшні час амаль забытая традыцыя перавялася на гаспадарскія панадворкі. У брамцы ставяць накрыты белым абрусам стол, на якім ляжыць хлеб і стаіць свечачка. Бацюшка асвячае ўсё і моліцца за здароўе мясцовых, жадаючы жыццёвых поспехаў.

Такая традыцыя існуе па сённяшні дзень у Машчонай-Каралеўскай. Вяскоўцы рыхтуюць крыжы на гары Провалы. Назва гары ўзялася ад слова „правалілі", а яе гісторыя звязана з іконаю Хрыста Ізбаўніка, пра якую ведаем з летапісаў. У Іпацьеўскім летапісе знаходзіцца інфармацыя, што ў 1260 годзе на Мельніцкую зямлю прыехаў галіцка-ўладзімірскі князь Васілька, каб у царкве св. Багародзіцы пакланіцца цудоўнай іконе. XIII-XIV стагоддзі гэта час, калі Мельніцкай зямлёю ўладарылі рускія князі. Тадышнія наезды татараў прымусілі манахаў уцякаць і хаваць ікону ў Мельніцкай пушчы. Апынуліся яны на горцы Провалы, ля струменьчыка, дзе неўзабаве паставілі драўляную царкоўку. У маленькай царкоўцы на высокай горцы знайшла сваё месца ікона Хрыста Ізбаўніка, а жыхары Мельніка правалілі яе назаўсёды, адтуль і ўзялася назва гары. Пасля некалькіх гадоў абаронцы святой іконы былі ўжо слабенькімі і ўваходзіць на высокую гару стала ім надта цяжка, таму перанесліся на Грабарку, дзе ставілася царква. Гара Провалы скрывала святы абраз да І сусветнай вайны. Яе апекуном быў добры чалавек Васілька, які выехаў у бежанства. У глыбіні Расіі прыняў ён духоўны сан і калі вярнуўся на радзіму, то штодзень уваходзіў на гару, каб маліцца Богу. З гэтага часу мясцовыя гару Провалы называюць гарою Васілька.

На свята пераходаў жыхары Машчонай-Каралеўскай збіраюцца ля крыжа на пачатку вёскі, дзе пачынаецца пераходная дарога. Шэсце ідзе праз вёску, пасля наступае асвячэнне вады. Наступным чынам пераходзяць на гару Васілька, каб на вышыні маліцца за здароўе і прасіць Госпада збаўлення. Пасля ўсе супольна ядзяць святочны абед у святліцы. На жаль, такое святкаванне сустракаецца надта рэдка. Гэта цудоўна, што дзе-нідзе магчыма яшчэ паглядзець забытую традыцыю.

# Аб сваіх прадстаўніках ва ўладах

Міхась КУПТЭЛЬ

Пад канец васьмідзесятых гадоў мінулага стагоддзя, калі вядома ўжо было, можа не на сто працэнтаў, што ўлада рабочых і сялян у Народнай Польшчы не ўтрымаецца, і калі подых змен можна было прыўважыць без спецыяльных навуковых даследаванняў, мой сусед па прыгарадской „дзялцы", калі ў перапынку на адпачынак згаварыліся мы пра палітыку, абураны кажа, што на Беласточчыне беларуская меншасць патрабуе мець сваіх прадстаўнікоў ва ўладах. Мой сусед па „дзялцы" не ведаў, што сваю думку выявіў якраз беларусу. Але нічога, падумаў я. Спрабуйма рассакрэціць суседаву думку.

Паважаны сусед, дапусцім, што ў Сопаце жывуць адны палякі, так як у Чыжоўскай або Дубіцкай гмінах жывуць у большасці беларусы. І гэтыя палякі патрабуюць мець ва ўладах горада Сопата прадстаўнікоў польскай нацыянальнасці, а не толькі літоўцаў, немцаў ды беларусаў. То мелі б яны рацыю, ці не? І ў той момант сусед, адукаваны чалавек, якому не чужыя былі элементы лагічнага мыслення, задумаўся. Фактычна, — кажа, — ва ўладах горада Сопата павінны быць найлепшыя прадстаўнікі яго жыхароў, а па нацыянальнасьці палякі таксама.

Дзесяцігоддзямі беларусаў ніхто і не пытаў якую яны хочуць мець уладу і таму наступае павольная дэнацыяналізацыя беларускай меншасці ўсходняй Беласточчыны, — кажу я. — Што ў тым дзіўнага, што ўлада прынамсі часткова павінна складацца з прадстаўнікоў розных нацыянальнасцей, калі так хочуць людзі. Хто ж лепей зразумее беларуса, які патрабуе каб не загінула яго культура, каб не баяўся прызнацца да сваёй тоеснасці, мала баяўся, але і мог ёю ганарыцца, як не беларус? Калі Польшча для ўсіх сваіх нацыянальных меншасцей з'яўляецца талерантнай дзяржавай, дык адкуль у суседа такая дзіўная канстатацыя, што беларусы патрабуюць ва ўладах мець сваіх прадстаўнікоў? — пытаю. Што ў тым дзіўнага, каб у раёне, дзе кампактна жывуць беларусы, мелі яны напр. падвойныя ўказальнікі. Жывём жа ў дэмакратычнай дзяржаве, прынамсі так запісана ў былой і цяперашняй канстытуцыі.

Праўда, вывад мой быў даўгаваты і мой сусед па „дзялцы" згадзіўся са мной, хоць гэта было пад канец васьмідзесятых гадоў мінулага стагоддзя і мы пайшлі далей калупацца на сваіх двухсотметровых участках зямлі.

PS. Прыпомнілася мне ўсё гэта, калі прачытаў я фельетон Яўгена Вапы „25 Сакавіка — 25 гадоў бесперарыўна 1985-2010" — „Ніва" № 14 ад 4.04.2010 г.

**М. К.**

Гайнаўка

# Злачынца затрыманы

18 траўня непадалёк Чаромхі паліцэйскія затрымалі 27-гадовага жыхара Бельска-Падляшскага, які папрасіў добразычлівага 24-гадовага шафёра легкавіка падвезці, затым абяссіліў яго паралізатарам, украў партфель з дакументамі і 2000 зл., выскачыў з аўтамабіля і ўцёк у лес. Раней ударыў яшчэ ахвяру ў галаву парожнім балончыкам з-пад газу. У выніку гэтага шафёр атрымаў невялікія пашкоджанні галавы і вачэй. Злачынца быў затрыманы гайнаўскай паліцыяй. У час допыту прызнаўся, што падобнае злачынства ўчыніў у сакавіку гэтага года на беларускім турысце. Тады пазбег адказнасці. Зараз стане перад судом.

Вось як злачынца адплаціўся чалавеку за яго добразычлівасць.

# Увага — пагроза!

21 траўня гайнаўскія паліцэйскія ў рамках адукацыйнай праграмы „Увага — пагроза" і „Стоп паталогіям" сустрэліся з вучнямі Пачатковай школы і Гімназіі ў Дубінах. Паліцэйскія і стажоры гаварылі з вучнямі аб насіллі ў час падарожжа ў школу і дамоў, таксама аб злачыннасці і парушэннях правапарадку малалеткамі ў крузе аднагодкаў, як і аб інтэрнэтавым насіллі. Вучні і гімназісты абмяркоўвалі пагрозы і здарэнні, якія выступаюць у школе і аб тым, як вырашаць такія праблемы. Адначасова паліцэйскія знаёмілі з законамі, якія вызначаюць адказнасць малалетак за парушэнне закону. **(ус)**

# Адгаданка




1. важнейшы за барона, 2. венік, 3. князь, 4. супраць абароны, 5. жыхар Бялграда, 6. 3,1416, 7. непагода, 8. установа з прэстыдыжытатарам, 9. дзікі чалавек, 10. драўляная дуга для нашэння вёдзер з вадой, 11. мятла, 12. адкрытая Калумбам.

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — афарызм Станіслава Леца.

**(ш)**

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

**Адказ на адгаданку з 21 нумара**

Водар, гора, Друць, Зюзя, зяць, індый, мітусня, урына, хан.

Рашэнне: **Дурні гавораць дурноты, а разумныя іх здзяйсняюць.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** і **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

**Выдавец**: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
**Старшыня**: Яўген Вапа.
**Адрас рэдакцыі:** 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
**Тэл./факс:** (+48 85) 743 50 22.
**Internet**: *http://niva.iig.pl/*
**E-mail**: *redakcja@niva.iig.pl*
***Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.***

**Галоўны рэдактар:** Яўген Вапа.
**Намеснік гал. рэдактара:** Віталь Луба.
**Тэхнічны рэдактар:** Адам Паўлоўскі.
**Рэдактар „Зоркі":** Ганна Кандрацюк-Свярубская.
**Публіцысты:** Міхась Андрасюк, Міколa Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
**Канцылярыя:** Галіна Рамашка.
**Друкарня**: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

**Prenumerata krajowa**
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130,5 zł.

**Prenumerata z wysyłką za granicę**
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

**Prenumerata w redakcji**
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2010 roku — 52.

**Poczta zwykła:** Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 6,50 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,70 zł.

**Poczta lotnicza:** Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,50 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,90 zł., — Ameryka Południowa — 8,30 zł., — Australia i Oceania — 10,50 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

**Nakład**: 1 250 egz.

# Простыя дадаткі да агіяграфіі бласлаўлёнага Папялушкі

Фота і тэкст Ганны КАНДРАЦЮК

Станіслаў Папялушка

*(пачатак у № 24)*

Пасля першага візіту ў Акопы я не ведала што думаць. Многія ранейшыя ўяўленні пра бласлаўлёнага Ежы Папялушку перакуліліся дагары нагамі. Я адчувала яго светласць і дапамогу, але ўразіла мяне бездапаможнасць і пачуццё крыўды з боку родных ксяндза-пакутніка. Брутальная смерць 17 кастрычніка 1984 г. нанесла балючы адбітак на здароўе і жыццёвыя праекты сям'і.

— Я не даў рады нават сярэдняй школы закончыць, — кажа Станіслаў Папялушка. — Людзі ўнікалі нас, прыдзіраліся без прычны…

— То куды вы хадзілі ў школу? — спыталі мы з прыадкрытымі ад здзіўлення ратамі.

— У Сухаволю…

— У той ліцэй, што зараз названы імем Ежы Папялушкі?

— У гэты самы!

— А я ў Беластоку вучыўся, — уключаецца ў размову сын нашага субяседніка, Ежы Павел Папялушка. Калі на першым уроку настаўнік пачуў яго імя і прозвішча, насмешліва хмыкнуў і заявіў: „Synu, u mnie nie masz szansy nawet na dwóję!"

— А пра які прадмет ідзе мова? — апошняе пытанне мы паставілі, каб пазбегнуць тыповых для падляшскай зямелькі падазрэнняў:

— Гэта было на першым уроку англійскай мовы, — пачулі мы ў адказ. І дадаў: — A z rosyjskiego to nigdy nie było problemu!

Яшчэ да прыезду ў Акопы мы дачыталіся, што і сам бласлаўлёны быў заўсёды выдатнікам па рускай мове. Пра беларускую мы не спыталі, бо тут ніколі яе не вывучалі ў школе. У Сухавольскай гміне нацыянальная свядомасць вызначаецца па рэлігійнай прымеце, і хоць жыхары, уключна з тутэйшымі татарамі, карыстаюцца простай мовай, беларусамі лічаць адно праваслаўных, а іх тут не так і многа. Карацей кажучы, прыналежнасць да рыма-каталіцкай царквы абазначае адно: ты паляк. Прытым паляк, калі прамяніць сучасныя беларускія меркі, са знакам якасці. Калі ў Станіслава Папялушкі я спытала: „А ці яны мазуры?" — той без сумнення адказаў: „Мы людзі!"

* * *

Многія турысты, якія прыязджаюць на радзіму бласлаўлёнага, спыняюцца адно ў Сухаволі, там наведваюць касцёл, сімвалічную магілу, ізбу памяці Ежы Папялушкі. У Акопы не ўсім па дарозе, а калі і наведаюць вёсачку, рэдка калі спыняюцца ля дома дзе бласлаўлёны нарадзіўся і ставіў першыя крокі. Быццам месца ахоўвае добрая сіла. Сам Станіслаў Папялушка, больш чым тыя экскурсіі, якія толькі замінаюць яму ў рабоце, перажывае што скажуць людзі ў вёсцы. І вельмі нервуецца калі тойсёй з аднавяскоўцаў напляце абы-чаго журналістам. Бо ж вядома, яны пасля яшчэ ўсё перайначаць або і прыдумаюць абы-што. На пачатку знаёмства мы таксама мусілі даць справаздачу пра што гаварылі з яго суседзямі.

— Хітрых то людзей многа ест, — кажа пра тых усіх, што шукаюць сенсацыі. — Прыедуць, пекне скажуць, возьмуць што ім трэба… І больш іх не ўбачыш. Лепш каб галавы не марочылі, нерваў не псавалі…

Апошнія словы мы адчыталі як апраўданне паводзін Марыянны Папялушкі. Калі мы падышлі да яе і папрасілі пагутарыць для беларускіх медыяў, жанчына нават не зірнула ў наш бок і паімчала дахаты. Яна нават не адрэагавала на заклікі сына і ўнука, якія прасілі яе спыніцца і сказаць слова.

— Бо не раз ужо было такое, — тлумачылі нам мужчыны. — Прыедуць журналісты, пранюхаюць, пасля пішуць як гэта размаўлялі з намі хаця іх ніхто і на вочы не бачыў! Пішуць сабе як размаўлялі з матуляй, вырэзваюць словы са старых газет, якія яна дваццаць гадоў таму дзесьці сказала…

Пасля апошніх слоў я зразумела адну рэч, якая не давала спакою, гартаючы шматлікія агіяграфіі і публікацыі пра Ежы Папялушку. У іх не хапала мне жывых вобразаў і дыялогаў праўдзівых сялян з жывой і праўдзівай вёскі.

* * *

Акопы ўразілі менавіта камеральнасцю і адначасова адкрытасцю ды ўвагай для нашай беларускамоўнай парачкі. Хоць у першы раз нам не пашанцавала пагутарыць з маці ксяндза, мы не крыўдавалі. Мы былі ўражаны прыгожасцю месца, дзе голас прыроды чутны на роўні з чалавечым. Сёння мяне здзіўляе, калі даследчыкі і агіёграфы пішуць пра добрыя адносіны бласлаўлёнага да жывёлы і расліннасці. У Акопах гэтая сувязь адчуваецца сама сабой. Стоячы каля хаты Папялушкаў мяне цягнула пайсці над рачулку, ахіленай альшынай і вербалозам, у якой расшчабяталіся салаўі. Здавалася, што там хаваўся ад хатніх думак будучы абранец Касцёла, каб у адзіноце пагутарыць з Усявышнім. Зараснік вызначае першую мяжу далягляду, ён знаходзіцца нейкія тры-ста метраў у простай лініі ад хаты. У канцы вёсачкі запамятаўся аграмадны кар'ер, які напамінаў старое яцвяжскае гарадзішча. Месца, хоць разрытае, дыхала нейкай тайнай. Разам хацелася думаць пра ідэалізм, якога ўжо не пабачым у сучаснай прыродзе. У час чарговай сустрэчы маці бласлаўлёнага ні адтуль, ні адсюль паставіць нам добрае пытанне:

— A kiedy człowiek jest najpiękniejszy? — спытала нас стогадовая Марыянна Папялушка. Хоць мы разумелі, што сучасныя меркі прыгожасці тут ні пры чым, так і не адгадалі простай мудрасці-загадкі. — Człowiek jest najpiękniejszy wtedy, — жанчына паглядзела на нас з дабрынёй, — jak na nikogo się nie gniewa.

Апошнія словы прагучалі як сінанім славутага лозунгу бласлаўлёнага: „Зло дабром перамагай!" І ў Акопах, сярод адкрытасці і простасці, прагучэлі яны не як заклік, а як нармальны жыццёвы прынцып атрыманы ад продкаў.

*(працяг будзе)*

Ліцэй у Сухаволі

## 27.06 — 03.07

**(22.03. — 20.04.)** Можа ахапіць цябе на хвіліну непатрэбнае знеахвочанне. Не паддайся, не адмаўляйся ад планаў; справішся лепш, чым думаюць іншыя. Патрабуеш цяпер саюзнікаў, а не людзей, якія крытыкуюць, кантралююць і глядзяць на рукі. У першыя дні ліпеня знойдзеш карысныя для тваіх фінансаў знаёмствы.

**(21.04. — 21.05.)** Перад табою шмат працы і абавязкаў. Ёсць і плюсы: за што возьмешся, зробіш дакладна і сумленна. Атракцыёны ў пачуццях; пазбудзешся комплексаў. Самотны Бык мае шанцы на вялікія змены; каханне можа паявіцца раптам.

**(22.05. — 22.06.)** Трэба будзе крыху змяніць канікульня планы. 26-27.06. не пакідай спраў уласнаму ходу, каб не ўцяклі з-пад кантролю. Афармляннe важных прафесійных спраў запляну на першую дэкаду ліпеня.

**(23.06. — 23.07.)** Будзеш поўны энергіі і здольны да адважных прыёмаў. Твая ўражлівасць і ўмеласць захавання сакрэтаў з'яднае табе нават непрыхільных людзей. Пры зацьменні Месяца будзеш мець праблемы з сур'ёзнымі рашэннямі. Можаш забыцца пра сардэчныя непаразуменні. Калі шукаеш кахання, застукаеш у сэрца, якое здаўна прыхільнае табе.

**(24.07. — 23.08.)** У апошнія дні чэрвеня вялікі шанц на прафесійны поспех. Дасягнеш яго дзякуючы добрым ідэям. Але варта ўзяць пару дзён адпачынку, асабліва таму, хто наракае на ныркі і шчытавідку. На жаль, 1-5.07. могуць прачнуцца ў табе благія ўспаміны; не траць энергіі на раздрапванне старых ран.

**(24.08. — 23.09.)** 26, 27.06. супакойся, сціш эмоцыі. 26-29.06. будзеш як спаралізаваны ў рашэннях. У ліпені пачнеш усё рабіць з вялікім энтузіязмам. Чакаюць цябе незвычайныя сітуацыі, ды не будзе гэта сляпы выпадак — перад табою прафесійныя поспехі!

**(24.09. — 23.10.)** Каля 27.06. не арганізуй дома ніякай імпрэзы. Затое справішся з кожнай праблемай, а нават найменшыя твае поспехі будуць заўважаны. Першая дэкада ліпеня вельмі радасная. Унутраная раўнавага і аптымізм.

**(24.10. — 22.11.)** 27-30.06. пераможаш усе перашкоды і зробіш проста немагчымае. Стаў перад табою амбітныя мэты! Ды пад канец чэрвеня чыесьці словы будуць раніць як меч! Хтосьці з табою не будзе лічыцца. Не думай аб прыкрых здарэннях з мінулага. Зачыні за сабою той раздзел!

**(23.11. — 22.12.)** У апошнія дні чэрвеня перастань балбатаць! Справы, якія цябе турбавалі, ужо за табою. Адчуеш палёгку і задавальненне. Лёс сыпане грашыма; не трэба будзе лічыцца з выдаткамі.

**(23.12. — 20.01.)** Апошнія дні чэрвеня — нядобрыя дні на падарожжы, негацыяцыі, экзамены; ахопіць цябе лянівасць. У першай дэкадзе ліпеня прыдасца табе хуткасць і ўмеласць энергічнага, рашучага дзеяння. Старайся трымацца плана.

**(21.01. — 19.02.)** Каля 27.06. старайся не вырашаць аб важных справах. Нечаканая змена планаў можа пайсці да дабра. Ліпень пад знакам кампанейскага жыцця і прафесійных выклікаў. Ды не бяры на сябе лішніх абавязкаў.

**(20.02. — 21.03.)** Не адкрывайся лішне перад асобай, у якой не зусім чыстыя намеры. Патрэба свабоды і адначасова ахвота трымаць усё пад кантролем могуць перашкодзіць у сувязях. Часцей усміхайся, тады лёс усміхнецца табе. У ліпені прадбачваецца карысны зварот у прафесійных справах.

**Агата АРЛЯНСКАЯ**

ISSN 0546-1960